Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.
Родная газета на роднай мове
# ЗВЯЗДА
30 ЧЭРВЕНЯ 2020 г. АЎТОРАК № 125 (29239)



ВЯРНУЦЬ НА ПРАВІЛЬНЫЯ РЭЙКІ 4

ЦІ ДАЧАКАЕЦЦА МОРА ТУРЫСТАЎ 9



## ЦЫТАТА ДНЯ



**Уладзімір СЯМАШКА, пасол Беларусі ў Расіі:**

*«Мы мяркуем, што ў жніўні прыступім да загрузкі на першы рэактар БелАЭС паліва. І далей пойдзе фізічны, а затым энергетычны пуск. Стаіць задача ў 2021 годзе (прынамсі ў першым квартале) цалкам запусціць у прамысловую эксплуатацыю першы энергаблок».*

З першых вуснаў

# «Сістэма адукацыі з'яўляецца найважнейшай, стратэгічнай галіной краіны»



Фота БелТА.

**Прэзідэнт Беларусі сустрэўся з педагагічным актывам рэспублікі. У размове прынялі ўдзел больш за 1000 чалавек з усіх рэгіёнаў краіны. У залу Нацыянальнага выставачнага цэнтра запрасілі выкладчыкаў, кіраўнікоў вышэйшых, прафесійна-тэхнічных, сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў, настаўнікаў школ.**

## СТАЦЬ ЛІДАРАМ ДУМАК

«Я запрасіў вас сюды таму, што вы з'яўляецеся, на мой погляд, апорай нашай дзяржавы, — звярнуўся Прэзідэнт да прысутных на сустрэчы. — Замяніць вас няма кім... Разам мы выхоўваем не толькі моладзь, але і наш народ».

Па словах Прэзідэнта, педагогі павінны стаць асобамі, якія фарміруюць меркаванне грамадства, і такімі ён іх лічыць. На думку Аляксандра Лукашэнкі, «сістэма адукацыі з'яўляецца найважнейшай, стратэгічнай галіной краіны, а не сферай паслуг». «Вы не проста навучаеце кваліфікаваных спецыялістаў, як бы пафасна гэта ні гучала, ***вы выхоўваеце грамадзян нашай краіны, фарміруеце інтэлектуальную эліту грамадства.*** Не бывае і не можа быць гэтай эліты без вас. Ды і самі вы практычна ўсе складаеце гэтую эліту», — падкрэсліў кіраўнік краіны.

СТАР. 2

# ЭКСКЛЮЗІЎНАЯ ПРАПОЛКА

Калі пачынаюць каласіцца хлебныя палеткі дзяржаўнага прадпрыемства «Жодзінааграплемэліта» Смалявіцкага раёна, можна ўбачыць на іх жанчын з нажніцамі ў руках — паляводаў, якія вядуць відавую праполку — гэта можна зрабіць толькі ўручную, бо, акрамя чалавека, гэта не здолее зрабіць ніводная, нават самая сучасная машына. На адным такім полі, засеяным элітнай пшаніцай, мне давялося паназіраць за работай незвычайных «аграцырульніц»: жанчыны зразалі каласкі іншых відаў збожжа, каб племянны элітны сорт не засмечваўся.

— Такая работа доўжыцца два летнія месяцы, да пачатку жніва, — расказала адна з удзельніц эксклюзіўнай праполкі Алена Баланчук. — Прыходзіцца пахадзіць па хлебных нівах у дзень па 12—14 кіламетраў.

Прадпрыемства «Жодзінааграплемэліта» — вядомая ў краіне гаспадарка па вырошчванні элітных збожжавых і зернебабовых культур. Але славу і поспех гаспадарцы робяць простыя жанчыны, як, напрыклад, гэтыя жыхаркі аграгарадка Барсукі — Таццяна КАЛЕСНІКЕВІЧ, Маргарыта ГАЛІНОЎСКАЯ, Кацярына МАРОЗАВА, Таццяна САКАЛОВА. Усё яны на гэтым здымку. На першым плане — Людміла МАЛІНОЎСКАЯ і Алена БАЛАНЧУК.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**



## КОРАТКА

- Мінабароны Кітая перадало беларускім ваенным медыкам гуманітарную дапамогу.



- **Больш як Br1 млн выплачана медыкам з прафсаюзнага страхавога фонду.**
- Дзіцячыя сады, спартыўныя аб'екты і святломузычны фантан адкрыюцца ў Мінску да Дня Незалежнасці.
- **Заяўку на ўдзел у рэспубліканскім конкурсе інавацыйных праектаў можна падаць да 30 верасня.**
- Натарыусы 2 ліпеня правядуць для грамадзян бясплатныя кансультацыі.
- **Універсітэт МНС і БДМУ запусцілі анлайн-курс для спецыялістаў з Калумбіі.**
- Смеццеперапрацоўчы завод плануюць запусціць у Лідскім раёне да 2025 года.
- **Анлайн-фестываль псіхалогіі пройдзе ў БДУ.**
- «КіноМінска» адкрыецца прэм'ерай Нолана 13 жніўня.

Жыццё не спыняецца

# ЯК ПРАВЕСЦІ ГЭТА ЛЕТА?

## Першыя беларусы ўжо грэюцца на моры, іншыя раскупляюць туры на адпачынак унутры краіны

**Каранавірус адступае, на змену яму прыходзіць добрае, цёплае беларускае лета, а разам з ім і адпускная пара. Як і дзе правесці свой адпачынак сёння — гэта адно з самых набалелых пытанняў тысяч беларусаў. Пра тое, як бачаць турыстычную індустрыю ў бліжэйшых месяцаў спецыялісты, расказалі прадстаўнікі Міністэрства спорту і турызму, а таксама турыстычнай грамадскасці краіны.**

### ТУРЫСТЫ Ў ЧАКАННІ МОРА

У сярэдзіне сакавіка, калі да пачатку самага гарачага турыстычнага сезона заставалася яшчэ пару месяцаў, пандэмія паставіла індустрыю ў вельмі складанае становішча. Міністэрству спорту і турызму ў тэрміновым парадку трэба было вывозіць сваіх суайчыннікаў з краін, якія пачалі закрываць межы, а турыстычным агенцтвам і аператарам вырашаць пытанні з запланаванымі адпачынкамі сваіх кліентаў. Прайшло ўжо тры месяцы, а гэтых пытанняў не становіцца менш.

СТАР. 9

ISSN 1990 - 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!
Вы яшчэ паспяваеце падпісацца на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе
ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

# «Сістэма адукацыі з'яўляецца найважнейшай, стратэгічнай галіной краіны»

## Сучаснае — на савецкай аснове

Па словах Прэзідэнта, у савецкія часы ў аснову адукацыі была пакладзеная любоў да Айчыны, імкненне сумленна працаваць, у тым ліку і за ідэю, што «ў апошнія часы не модна». Дзякуючы такой аснове Беларусь змагла вытрываць ліхія 90-я і стварыць незалежную дзяржаву. Менавіта на савецкай мадэлі наша краіна стварыла сваю суверэнную сістэму адукацыі.

«Многія элементы савецкай адукацыі паспяхова выкарыстоўваюцца сёння і на Захадзе, і на Усходзе. Я маю на ўвазе перш за ўсё вялікі Кітай, ды і Індыя не грэбуе пазычыць тое, ад чаго мы спрабавалі адмовіцца. І вы бачыце, якімі тэмпамі сёння развіваюцца гэтыя наймагутнейшыя дзяржавы свету», — заявіў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, як, стаўшы кіраўніком краіны ў 90-я, заявіў пра тое, што не трэба нічога ламаць, а неабходна ўдасканальваць тую сістэму адукацыі, якая ў нас ёсць, была і будзе.

І як адзначыў беларускі лідар: «Мы не толькі захавалі, але і памножылі найлепшыя традыцыі вышэйшай школы».

## Важкія аргументы на карысць якасці

Сёння ў Беларусі ёсць свае вучоныя, краіна самастойна развівае запатрабаваныя эканомікай кірункі, ВНУ могуць праводзіць прыкладныя даследаванні. Па інфармацыі ПРА ААН, па паказчыках сферы адукацыі Беларусь уваходзіць у трыццатку найбольш развітых краін свету. Павялічыўся экспарт адукацыйных паслуг — адукацыю атрымліваюць на 20 тысяч больш замежнікаў, чым у першыя гады незалежнасці.

***«Тое, што да нас паехалі вучыцца замежнікі, сведчыць пра многае.*** Гэта канкрэтны і важкі аргумент на карысць якасці адукацыі», — заўважыў Прэзідэнт.

Развіваецца практыкаарыентаванае навучанне спецыялістаў — на высокатэхналагічных прадпрыемствах, арганізацыях Парка высокіх тэхналогій, інстытутах НАН.

Як адзначыў Прэзідэнт, у краіне рэалізуецца мадэль «Універсітэт 3.0» (развіваецца на базе 8 ВНУ ) — сімбіёз адукацыі, навукі і прадпрымальніцтва.

Сёння каля 90 працэнтаў абітурыентаў уладкоўваюць у інтэрнаты. «У гэтым кірунку мы будзем рухацца і ў будучай пяцігодцы. З інтэрнатамі для студэнтаў разбяромся, ***і кожны студэнт будзе мець сваё месца ў інтэрнаце»,*** — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка, нагадаўшы пра гонар — студэнцкую вёску ў Мінску, дзе ўмовы пражывання на ўзроўні трохзоркавага атэля.

## Не прывілеі, а магчымасць для кожнага

Усе дасягненні, як адзначыў Прэзідэнт, сталі магчымыя дзякуючы ўдумліваму, плаўнаму ўдасканаленню сферы адукацыі.

«Для нас было важна не звесці сістэму адукацыі да сферы паслуг, не накіраваць толькі на спаганнне прыбытку. ***І я лічу адным з нашых значных дасягненняў тое, што мы захавалі магчымасць для ўсіх абітурыентаў атрымліваць вышэйшую адукацыю па конкурсе бясплатна.*** Замацавалі гэта права ў Канстытуцыі»,— падкрэсліў лідар.

Яго здзіўляе, што многія асобы ў палітыцы, якія ў свой час атрымалі бясплатную адукацыю, дбаюць толькі аб платным навучанні. «Гэта значыць, што дзеці з рабочых сем'яў, нават таленавітыя і разумныя, проста не змогуць дазволіць сабе такую раскошу, як вышэйшая адукацыя. Маю адзначыць, што 90 працэнтаў у гэтай зале такія ў свой час дзеці, якія атрымалі адукацыю такім чынам. І калі вярнуцца ў тое мінулае, як я часта сябе прывожу ў прыклад, кажучы пра сучаснае тэсціраванне, мы б не сталі тымі, хто мы ёсць, вы б не сталі дактарамі навук, прафесарамі. А пра прэзідэнцтва мне і казаць няма чаго», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Як, дадаў ён, нам не падыходзіць мадэль многіх краін, дзе супольнасць падзелена на эліту і працоўны клас, на тых, каму даступная і недаступная прывілея вучыцца ва ўніверсітэтах.

«Вы ведаеце маю пазіцыю. ***У нас кожны, нават з самай глыбінкі, можа стаць студэнтам, калі мае веды і жаданне вучыцца.*** Гэтаму прынцыпу павінна адпавядаць і сістэма ўступных экзаменаў. ***Пры адборы ў ВНУ прыёмнай камісіі неабходна бачыць чалавека, а не толькі і не столькі вынік тэсціравання»,*** — акцэнтаваў увагу Прэзідэнт і заявіў, што да наступнай уступнай кампаніі будуць распрацаваны новыя правілы паступлення.

Па словах Аляксандра Лукашэнкі, ён як выкладчык ведае, што ***«вельмі важна размаўляць вочы ў вочы, бачыць чалавека».***

«Сістэмай тэсціравання ў найлепшыя ВНУ краіны мы адсякаем працавітую, здольную моладзь, бацькі якой не ўваходзяць у эліту нашай краіны, — сказаў лідар краіны. — Сама сістэма не дае магчымасці паступіць у ВНУ хлопцам і дзяўчатам з сельскіх школ, дзе выкладанне яшчэ крыху ніжэй, чым у буйных гарадах і Мінску, дзе няма такога распаўсюджанага рэпетытарства».



Фота БелТА.

Па словах Прэзідэнта, выкладчыкі ўмеюць разгледзець у абітурыенце будучага грамадзяніна і патрыёта, за тэсціраваннем «пры ўсіх яго станоўчых якасцях мы гэтага не бачым».

***«Таму ўзяўшы найлепшае з мінулай сістэмы паступлення ў ВНУ, тэсціравання, якое мы ўжо прайшлі, гузакі набілі, пастаўлена задача перад Міністэрствам адукацыі (гэта і задача вам) — да наступнай уступнай кампаніі стварыць новыя правілы паступлення ў ВНУ»,*** — заявіў Аляксандр Лукашэнка, адзначыўшы, што навацыі будуць шырока абмяркоўвацца, а работа будзе праходзіць у рамках стварэння Кодэкса аб адукацыі.

Прэзідэнт паведаміў, што на працягу будучай пяцігодкі заробкі педагогаў давядуць да 150 працэнтаў ад сярэдняга па краіне.

«Імкнёмся ўсяляк падтрымліваць вас, у тым ліку матэрыяльна. Пачата паэтапнае павышэнне зарплаты прафесарска-выкладчыцкага складу. На працягу будучай пяцігодкі мы абавязкова давядзём заработную плату ў вас да 150 % ад сярэдняй па краіне», — заявіў Прэзідэнт.

## Ісці ў нагу з тэхналогіямі

На думку Аляксандра Лукашэнкі, сёння навуковай супольнасці трэба знайсці адказ на пытанне, якой мы бачым адукацыю будучыні?

Новыя мадэлі часам зводзяць да інфармацыйных тэхналогій. «Але я прыхільнік простай ідэі — не зможа ні сёння, ні ў агляднай будучыні не адзін айцішнік, нават самы прасунуты накарміць, абуць і адзець чалавека», — выказаўся Прэзідэнт. Навучанне ІТ павінна, на думку кіраўніка краіны, быць на стыку рэальных галін, а інфармацыйныя тэхналогіі — стаць звычайнай кампетэнцыяй.

У перыяд пандэміі на першы план выйшла дыстанцыйная адукацыя і, па словах Прэзідэнта, стала відавочна, у якіх установах гэта форма мела фармальны характар. «Адны рабілі выгляд, што вучаць, а іншыя, што вучацца. Я думаю, усе зрабілі выснову аб сваёй гатоўнасці ці негатоўнасці ісці ў нагу з часам. Згодны, што дыстанцыйная адукацыя павінна стаць адным з дапаможных элементаў», — заявіў Прэзідэнт, але ўпэўнены, што аддаленая адукацыя не заменіць рэальныя лекцыі і заняткі ў аўдыторыях.

Ён падкрэсліў неабходнасць заняць моладзь у час летняга адпачынку — «залучыць, а не ўцягнуць воламі».

«На жаль, ***у параўнанні з савецкім перыядам мы адкацілі назад у рабоце з моладдзю.*** Кожны ўніверсітэт, інстытут, факультэт павінен мець набор такіх механізмаў работы, і альтэрнатыва віртуальнаму жыццю павінна быць цікавая. Мы гэта выправім», — сказаў Прэзідэнт.

Па яго словах, у інфармацыйнай прасторы нашай моладдзю ўжо займаюцца іншыя ідэолагі і выхаваўцы, часам са злачыннымі намерамі.

«Вы — вопытныя выкладчыкі, дзяржаўнікі, не горш за мяне ведаеце, як важна вучыць студэнтаў думаць, рабіць самастойныя вывады, выходзіць за рамкі праграмы, самаадукоўвацца, але не губляць сувязь з дзяржаўнай ідэалогіяй. І не трэба баяцца гэтага слова. Пакажыце мне хоць адну краіну ў свеце моцную і самадастатковую, якая не надае гэтай тэме вялікае значэнне?» — задаў рытарычнае пытанне кіраўнік краіны.

У прыклад ён прывёў ЗША, у якой гэтыя тэхналогіі не называюць ідэалогіяй, але імі пранізаны ўсе галіны жыццядзейнасці людзей.

«Яшчэ раз скажу: ***не будзем займацца сваімі дзецьмі мы, імі зоймуцца чужыя настаўнікі гэтага жыцця.*** І тады ў гісторыі незалежнай Беларусі, якую павінны працягнуць нашы дзеці, можна паставіць кропку», — зазначыў Аляксандр Лукашэнка.

Марыя ДАДАЛКА.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

# «На чужой зямлі вы не будзеце беларусамі»

## Найлепшыя педагогі і выпускнікі беларускіх ВНУ атрымалі Падзякі Прэзідэнта

**Сукенкі да падлогі ў дзяўчат, бабачкі ў хлопцаў, ва ўсіх узнёслы настрой і шчаслівыя ўсмешкі... Вылучаюцца сярод выпускнікоў тыя, хто ў і гэты ўрачысты дзень у форме — вядома, асабліва парадная. Традыцыйна прыняў удзел у балі выпускнікоў «Пакаленне будучыні» і кіраўнік дзяржавы.**

Аляксандр Лукашэнка павіншаваў маладых людзей з заканчэннем ВНУ і атрыманнем доўгачаканага дыплома, які назваў самым важным дакументам у жыцці любога чалавека.

«Я ведаю, гэтыя гады былі яркія і цікавыя, але і нялёгкія. Асвоіць прафесію — вялікая праца. І я шчыра ганаруся тым, што вы прайшлі гэты шлях годна. Вы зрабілі галоўнае — зразумелі сваё прызначэнне. Гэта сведчыць аб вашай грамадзянскай сталасці і ўсвядомленай гатоўнасці стаць грамадзянінам Беларусі. І ўжо заўтра вы пачняце ўвасабляць у жыццё свае мары і рэалізаваць амбіцыйныя планы», — звярнуўся да моладзі Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка мяркуе, што ў большасці гэтыя мары і планы менавіта такія: глабальныя і ў добрым сэнсе дзёрзкія, якімі і павінна адрозніваецца кожнае новае пакаленне моцнай і незалежнай краіны. Таму Аляксандр Лукашэнка перакананы, што ў выпускнікоў усё атрымаецца.

«Абавязкова атрымаецца, калі вы будзеце жадаць і імкнуцца да гэтага. Па-іншаму быць не можа, таму што мы — беларусы, нацыянальны характар якіх фарміраваўся стагоддзямі», — звярнуў увагу лідар краіны.

Па словах першай асобы дзяржавы, у кожным з удзельнікаў сённяшняй урачыстасці закладзены найлепшыя нацыянальныя рысы — беларуская працавітасць, адказнасць, дысцыплінаванасць, а таксама неабыякавасць, адкрытасць і адданасць роднай зямлі.

«У год 75-годдзя Вялікай Перамогі хачу нагадаць, ***што ўсе мы — яшчэ і спадчыннікі пераможцаў. Гэта да многага абавязвае, але, галоўнае, дае вам права ганарыцца сваім паходжаннем, сваёй краінай і сваёй гісторыяй.*** І глядзячы на вас, такіх прыгожых, разумных, мэтанакіраваных, я думаю толькі аб адным: каб праз гады вы таксама, як і мы, старэйшае пакаленне, расказвалі сваім дзецям і ўнукам, як будавалі сваю незалежную Беларусь, як захавалі і прымножылі наша нацыянальнае багацце, як зберагалі мір і згоду ў грамадстве, як ганарыцеся продкамі і беражаце традыцыі», — марыць Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка выказаў радасць, што моладзь ужо ўключана ў рэальнае жыццё, а не ілюзорнае, якое часам нам спрабуюць навязаць, што многія адбыліся як маладыя навукоўцы, педагогі, лекары, вытворцы, актыўна рэалізуюць свае таленты ў культуры і мастацтве.

Асабліва Прэзідэнт адзначыў выпускнікоў медыцынскіх ВНУ, якія ў экстрэмальнай сітуацыі праявілі сябе сапраўднымі прафесіяналамі: у барацьбе за здароўе чалавека смела, плячо ў плячо ўсталі побач са сваімі старэйшымі калегамі, у складаны перыяд паказалі, што айчынная ахова здароўя, жыццё і здароўе людзей, будучыня краіны, як і раней, будзе ў надзейных руках.

«З такімі маладымі людзьмі я яшчэ сустрэнуся. Хачу ўсім вам, нашы дарагія выпускнікі, пажадаць галоўнага — зберагчы сваю краіну. Гэта не абстрактнае паняцце — гэта тое, што дазволіць вам і наступным пакаленням заставацца беларусамі. ***На чужой зямлі вы не будзеце беларусамі — толькі на сваёй. Гэта дазволіць самім прымаць рашэнні ў сваім жыцці і жыцці краіны, а не азірацца па баках і думаць, што скажуць ці, яшчэ горш, пакажуць з Усходу ці Захаду, не пакланяцца ўсяму замежнаму, не пераймаць чужыя традыцыі, а самім стаць узорам, на які захочуць раўняцца іншыя краіны і народы»,*** — падкрэсліў кіраўнік Беларусі.

Аляксандр Лукашэнка заклікаў зрабіць усё, каб традыцыі жылі, бо пакуль яны ёсць, народ мае права так называцца.

«Я ўпэўнены, што вы можаце зрабіць гэта. Зрабіце гэта, калі ласка. І нашай роднай Беларуссю, якую вы захаваеце і зробіце яшчэ больш прыгожай і моцнай, будуць тады ганарыцца вашы нашчадкі!», — звярнуўся да моладзі Прэзідэнт.

Штогод ён заклікае выпускнікоў рабіць усё ў свой час.

«Калі вы сёння чагосьці не зрабілі, заўтра, магчыма, не зможаце. Прыйдуць іншыя людзі, надыдзе новы час, які запатрабуе ад вас іншых дзеянняў і крокаў. Таму тое, што вы павінны зрабіць сёння, рабіце сёння. Пакажыце ўсяму свету і некаторым нашым, хто не бачыць ці аслеп, што ў нас ёсць сапраўдная моладзь — прыгожая, разумная, якая разумее тое, што адбываецца ў жыцці, і абавязкова накіраваная ў будучыню», — папрасіў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка ўзнагародзіў найлепшых выкладчыкаў і выпускнікоў і яшчэ раз павіншаваў прысутных з радасным днём.

Варвара МАРОЗАВА.

Блізкая ўлада

# Шумнае суседства, прыпынкі і асвятленне вуліц

**Прамую лінію з жыхарамі Магілёўшчыны правёў у суботу, 27 чэрвеня, старшыня аблвыканкама Леанід ЗАЯЦ. Да яго дазваніліся 30 заяўнікаў.**

Адразу некалькі званкоў было ад жыхароў адной з цэнтральных вуліц абласнога цэнтра: людзей непакоіць крама, якая з нядаўняга часу працуе кругласутачна. Як паведамілі заяўнікі, там збіраецца шмат народу, асабліва па начах, многія паводзяць сябе неадэкватна: уключаюць гучна музыку, шумяць у дварах, б'юцца і ўжываюць алкаголь. Гараджане прасілі звярнуць увагу на сітуацыю, бо гэта не толькі псуе імідж горада, але і перашкаджае жыхарам спакойна адпачываць па начах. Губернатар узяў гэтыя звароты на кантроль і даручыў адказным структурам навесці парадак.



З розных раёнаў Магілёва заяўнікі агучвалі праблемы, звязаныя з добраўпарадкаваннем тэрыторый, што прылягаюць да іх дамоў. Адну гараджанку хвалявала адсутнасць вулічнага асвятлення, дакладней, тое, што яно не працуе. Жанчына паскардзілася, што складана дабірацца дахаты, калі на вуліцы цёмна, тым больш у дрэннае надвор'е. З такой жа праблемай знаёмы і жыхар Бабруйска, які агучыў, што яго дом знаходзіцца ў тупіку вуліцы, які не асвятляецца. Усе звароты ўзяты на кантроль.

Некаторыя жыхары Магілёўшчыны тэлефанавалі на прамую лінію да старшыні аблвыканкама, каб паведаміць, што ім недаплацілі ці наогул не выплацілі заробак. Такія сігналы былі з Хоцімскага і Глускага раёнаў. Леанід Заяц падкрэсліў, што недапушчальна абыходзіцца так з людзьмі. Адказным структурам даручана тэрмінова разабрацца ў сітуацыях, якія склаліся.

З просьбай зрабіць дадатковы прыпынак грамадскага транспарту ў адным з пасёлкаў Чавускага раёна звярнуўся жыхар Магілёва. Ён растлумачыў, што ў вёсцы шмат пажылых, а працягласць населенага пункта больш за тры кіламетры: сталым вяскоўцам проста цяжка ісці да прыпынку, які існуе. Губернатар паабяцаў, што гэтае пытанне будзе вырашана.

— Улада не павінна закрываць вочы на праблемы жыхароў рэгіёна. 90 % сённяшніх званкоў — гэта пытанні бягучага характару. І мясцовая ўлада павінна была даўно звярнуць на іх увагу ды вырашыць на месцах. Але пытанні засталіся невырашанымі. У гэтым кірунку неабходна правесці больш шчыльную работу, — падкрэсліў Леанід Заяц. Па яго словах, поспех у вырашэнні праблем нашых жыхароў — гэта сумесная дзейнасць кіраўнікоў адміністрацый, упраўленняў жыллёва-камунальнай гаспадаркі, ЖЭУ і іншых структур.

— Але і людзі павінны адказна ставіцца да таго, што адбываецца вакол іх. Можна і самому абкасіць траву, што вырасла побач з домам, а не чакаць, пакуль іншыя прыйдуць і гэта зробяць. Усё, што залежыць ад выканаўчай улады, мы робім. І імкнёмся па-чалавечы і з разуменнем ставіцца да кожнага звароту, — рэзюмаваў ён.

# У ПРЫЯРЫТЭЦЕ — ДОБРАЎПАРАДКАВАННЕ



**Прамую лінію з жыхарамі вобласці правёў у мінулую суботу старшыня Брэсцкага аблвыканкама Анатоль ЛІС: за тры гадзіны да кіраўніка вобласці дазванілася 25 чалавек.**

У прыярытэце, як заўсёды, былі пытанні добраўпарадкавання, паляпшэння тэрыторый, рамонту дарог. Падобныя звароты ў ліку першых паступілі з Баранавіч і Брэста. Людзі цікавіліся аднаўленнем дзіцячых пляцовак. Яно і зразумела: прыйшло лета, дзеці больш гуляюць на свежым паветры. І аднаму, і другому заяўнікам паабяцалі, што работа будзе праведзена камунальнымі службамі разам з мясцовым насельніцтвам.

Шматдзетны бацька з вёскі Палонка Баранавіцкага раёна збіраецца ўзводзіць дом для сям'і, але з выдзяленнем участка мясцовая ўлада марудзіць. Вось і пазваніў на прамую лінію. Грамадзяніну растлумачылі, што ўчастак выдзеліць можна, калі падвядзены ўсе камунікацыі, таму найчасцей і выходзіць затрымка. Але ў яго канкрэтным выпадку абяцалі разабрацца. Да слова, падобны званок паступіў летась з вёскі Тэльмы Брэсцкага раёна. Праблема вырашылася, і жыхарка названай вёскі дазванілася, каб падзякаваць за дапамогу.

А з Лунінецкага раёна паскардзіліся, што цяжка дабірацца на папулярнае месца адпачынку — возера Белае. Цана пытання — два кіламетры дарогі, якія трэба заасфальтаваць. Адказныя асобы атрымалі даручэнне вывучыць сітуацыю і даць абгрунтаваны адказ заяўніку.

На прамую лінію паступілі звароты з Брэста, Баранавіч, Бярозаўскага, Пружанскага, іншых раёнаў.

**Паводле БелТА.**

На слыху

# ПРАЗРЫСТА І АДКРЫТА

## Маюць намер правесці гарадскі рэферэндум у Брэсце ў дачыненні да лёсу акумулятарнага завода

«Рэферэндум трэба правесці максімальна адкрыта», — сказаў **старшыня Брэсцкага гарвыканкама Аляксандр РАГАЧУК** на сустрэчы з гараджанамі, якая прысвячалася абмеркаванню пытанняў арганізацыі і падрыхтоўкі правядзення гарадскога рэферэндуму ў дачыненні да акумулятарнага завода, што размешчаны ў свабоднай эканамічнай зоне «Брэст».

Гэта тэма ўзнікла пасля наведвання Прэзідэнтам краіны горада над Бугам 22 чэрвеня. Як вядома, кіраўнік дзяржавы сустрэўся з працаўнікамі акумулятарнага завода і выказаў прапанову правесці гарадское галасаванне, каб раз і назаўсёды вырашыць лёс праблемнага прадпрыемства.

Коратка нагадаю гэтую гісторыю. У СЭЗ «Брэст» завод узвяла кампанія «АйПаўэр». Ён размешчаны менш чым за дзесяць кіламетраў ад мяжы абласнога цэнтра. Яго будаўніцтва выклікала хвалю незадаволенасці ў жыхароў горада і навакольных населеных пунктаў Брэсцкага раёна. Людзі лічаць, што прадпрыемства нясе пагрозу для іх здароўя. З лютага 2018 года кожную нядзелю на плошчы Леніна ў Брэсце сустракаюцца працаўнікі акумулятарга завода.

Год таму **старшыня аблвыканкама Анатоль ЛІС** падпісаў распараджэнне аб прыпыненні будаўніцтва завода «да ўстаранення выяўленых недахопаў» у ходзе экалагічнай экспертызы. Потым былі заведзены крымінальныя справы ў дачыненні да кіраўнікоў названай кампаніі. У маі гэтага года акумулятарны завод ТАА «АйПаўэр» вывелі з-пад кантролю групы кампаній 1AK GROUP і прадалі іншым уласнікам. У выніку завод атрымаў назву ТАА «Акумулятарны альянс».

Пасля сустрэчы Прэзідэнта з актывістамі ў Брэсце **новы дырэктар Дзмітрый БУТАЎ** на сваёй прэс-канферэнцыі расказаў аб планах новага кіраўніцтва. Дырэктар паведаміў, што зараз на прадпрыемстве дзейнічае забарона на будаўніча-мантажныя работы, гэта значыць, завод не працуе. На прадпрыемстве знаходзіцца персанал, які сочыць за станам інфраструктуры, падтрымлівае ў парадку абсталяванне.

Дырэктар расказаў таксама, што ў адміністрацыі завода вывучаюць патрабаванні заканадаўства аб правядзенні мясцовых рэферэндумаў. Менавіта станоўчы вынік рэферэндуму на прадпрыемстве чакаюць як сігнал да зняцця забароны на будаўніча-мантажныя работы. А іншы сцэнарый развіцця падзей тут пакуль каментаваць не гатовыя.

Дзмітрый Бутаў, дарэчы, запрашаў усіх ахвотных наведаць завод, каб асабіста азнаёміцца з абсталяваннем, інжынернымі сеткамі, газаачышчальнымі ўстаноўкамі, а таксама любымі дакументамі. Для гэтага трэба толькі папярэдне запісацца. «Мы ўзялі курс на поўную адкрытасць для ўсіх грамадзян, незалежна ад ступені іх актыўнасці ў праціўдзеянні адкрыццю завода і гатовыя да канструктыўнага дыялогу», — падкрэсліў дырэктар.

А вось Аляксандр Рагачук разглядае любыя сцэнарыі развіцця падзей, у тым ліку і закрыццё завода. Пра гэта ён выказаўся на сустрэчы з актывістамі ў мінулую нядзелю. Сустрэча адбылася ў зале гарвыканкама. На мерапрыемства сабраліся паўтары сотні чалавек. «Я настроены зрабіць гэту работу — рэферэндум — максімальна празрыстай, максімальна адкрытай і тым самым задаць добрую планку нашай гарадской дэмакратыі», — падкрэсліў кіраўнік горада.

На сустрэчы абмяркоўвалі, хто будзе ініцыяваць рэферэндум. Гэта можна зрабіць, напрыклад, шляхам збору подпісаў. Але мэр прапанаваў даручыць ініцыятыву гарадскому Савету дэпутатаў. Былі розныя меркаванні, урэшце сышліся на тым, што спачатку пытанне разгледзіць сесія гарсавета.

Яшчэ адно важнае пытанне датычыцца тэрыторыі, на якой варта праводзіць галасаванне. Зноў жа, мэр прапанаваў Брэст і Тэльмінскі сельсавет. Актывісты запярэчылі, яны лічаць мэтазгодным уключыць больш населеных пунктаў Брэсцкага раёна ў зону рэферэндуму. Большасць з залы пагадзілася з актывістамі.

Хоць яшчэ далёка да стварэння ўчастковых камісій па галасаванні, абмяркавалі і названую тэму. Размова можа ісці пра 133 участкі, на кожным з якіх будзе працаваць ад 5 да 19 чалавек. Каардынацыю работы па правядзенні мясцовага рэферэндуму ў складзе гарадской камісіі даручылі **актывістцы Алене ГАЛУЗЕ.** І што самае важнае, Аляксандр Рагачук заверыў, што ўсе ахвотныя змогуць трапіць у склад участковых камісій.

У найбліжэйшы час кіраўнік горада мае намер сустрэцца з новымі гаспадарамі завода. Аб гэтым ён паведаміў грамадзе. Закончылася сустрэча тым, што многія яе ўдзельнікі сталі запісвацца ў склад выбарчай камісіі, якая будзе створана пасля аб'яўлення мясцовага рэферэндуму.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

Меркаванне

# Заўсёды трэба глядзець і аверс, і рэверс



**Ігар ГЕДЗІЧ, дырэктар Гродзенскага абласнога драматычнага тэатра, член Савета Рэспублікі ад Гродзенскай вобласці:**

— Падчас размовы з рознымі людзьмі, якія крыху інакш лічаць, я пытаю: «Што для вас самае галоўнае?» Яны кажуць — незалежнасць і суверэнітэт. Вось, адказваю, мы падобныя з вамі: для мяне таксама — незалежнасць і суверэнітэт, толькі можа быць адзінкі вымярэння ў нас крыху адрозныя, але для мяне гэтыя рэчы — першасныя! І беларускі народ, дакладна, кажа аб гэтым. Іншая справа, што адбываюцца маніпуляцыі, асабліва ў гэтых адносінах. З майго пункту гледжання, радыкалізм некаторых сродкаў масавай інфармацыі негатыўна ўплывае на людзей. На жаль, тыя, хто не вельмі цікавіцца палітыкай, абсалютна кіруемыя і трапляюць пад дэканструктывізм, скажам так, і гэта шкада. Хочацца, каб людзі проста асэнсоўвалі, што было ў нас 25 гадоў таму і да чаго мы прыйшлі, дзе мы былі чвэрць стагоддзя таму і што адбываецца зараз — гэта грандыёзныя рэчы! Калі людзям кажаш, напрыклад, а ці ведаеце, што робіцца? Часам даводзіцца чуць, маўляў, блага ў нас да культуры ставяцца. А я са свайго боку прыводжу прыклады нават па Гродзенскай вобласці: Свяцка, Старога замка, філармоніі, Мірскага замка...

Людзі чамусьці гэтага не жадаюць ведаць: ім нехта ў вушы ўвёў, маўляў, нягледзячы на дасягненні, выйдзем на вуліцы — мы ж людзі. І тут спрацоўвае адкрытая, фальшывая, беспардонная лухта. Гэта датычыцца і фэйкавых публікацый: чалавек прачытаў адзін раз, а абвяржэння ён не чытае, таму ў яго складваецца абсалютна негатыўнае ўражанне. Хоць заўсёды трэба глядзець аверс і рэверс. Заўсёды. І калі ёсць жаданне, ты цікаўны (а я лічу, што чалавек павінен быць цікаўны ў нейкай ступені, калі гэта датычыцца будучыні сваёй краіны), то, напэўна, гэта і трэба рабіць. У любым выпадку фраза «добра там, дзе нас няма» непрымальная. Там, дзе мы ёсць — выдатна! Я люблю каардынаты, у якіх жыву і ўпэўнены, што будучае нашай краіны залежыць ад кожнага з нас, ад нашай смелай, адказнай і карпатлівай працы.

## У Мінску пройдзе велапрабег па знакавых мясцінах

**1 ліпеня ў Мінску ў 14.00 стартуе велапрабег #раЗАм, прысвечаны Дню Незалежнасці Рэспублікі Беларусь, арганізатарам якога выступае Мінская гарадская арганізацыя БРСМ (пр-т Незалежнасці, 116, Нацыянальная бібліятэка Беларусі).**

Маршрут велапрабегу праляжа па сталіцы праз шэраг знакавых аб'ектаў — Нацыянальная бібліятэка Беларусі — Палац Рэспублікі — Палац спорту, Музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны — плошча Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь.

Удзельнікамі мерапрыемства стануць больш за паўсотні чалавек — актывісты БРСМ, беларускія спартсмены і парламентарыі, сярод якіх — Яўген Каралёк, уладальнік «золата» ў скрэтчы на чэмпіянаце свету па веласпорце на трэку ў Берліне ў 2020 годзе, дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Людміла Макарына-Кібак, Ігар Марзалюк, Сяргей Клішэвіч і іншыя. #раЗАм яны пераадолеюць дыстанцыю ў 15 кіламетраў, пры гэтым у кожнага на вопратцы будзе прысутнічаць нацыянальны арнамент.

З ініцыятывай правесці велапрабег #раЗАм напярэдадні галоўнага свята беларускай дзяржаўнасці выступіла моладзь Мінска.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

**Члены Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выражаюць глыбокія спачуванні міністру юстыцыі Рэспублікі Беларусь Алегу Леанідавічу Сліжэўскаму ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ.**

## Юрый КАРАЕЎ:

# «МЫ ІДЗЁМ НАСУСТРАЧ ЛЮБЫМ ПАДЗЕЯМ»

**У Акадэміі Міністэрства ўнутраных спраў быў святочны дзень. Сорак пяць выпускнікоў, якія атрымалі дыпломы з адзнакай, развіталіся са сваёй альма-матар. Яны скончылі факультэты міліцыі, следча-экспертны і крымінальна-выканаўчы. Сярод маладых лейтэнантаў, якія зусім хутка прыступяць да нясення службы, — адзінаццаць прэзідэнцкіх стыпендыятаў і прэміянтаў, занесеных у рэспубліканскі банк адоранай моладзі, а таксама сямнаццаць залатых медалістаў.**



Павіншаваць выпускнікоў прыбыў **міністр унутраных спраў Юрый КАРАЕЎ.**

— У лёсе кожнага чалавека здараецца падзея, памяць аб якой захоўваецца назаўжды, — зазначыў кіраўнік ведамства. — Сёння — адна з такіх падзей, калі вы папоўніце афіцэрскі склад сілавых структур. Мне самому зразумелыя ўсе цяжкасці, якія адчувае кожны афіцэр міліцыі — падчас будняў кожнага ўчастковага, аператыўніка, супрацоўніка ДАІ. Рамантызму там мала. А вось чаго шмат, дык гэта чалавечых лёсаў. Звычайныя людзі імкнуцца абысці бокам непрыемныя падзеі, а мы, наадварот, ідзём ім насустрач. І спрабуем перапыніць іх. Гэта патрабуе вялікіх душэўных якасцяў, каб не ачарсцвець душой. Памятайце — у гэтую прафесію вы прыйшлі не зарабляць грошы, а абараняць людзей.

Юрый Караеў зазначыў, што першай думкай заўсёды павінна быць абарона людзей.

**Адзін з выпускнікоў, Уладзіслаў ЛЕМЯШОНАК,** не раз удзельнічаў у навуковых канферэнцыях. Яго распрацоўкі былі прысвечаны розным аспектам — ад дзейнасці малодшага камандзіра да нюансаў работы ўчастковага інспектара. Менавіта на гэтую пасаду ён і размяркоўваецца.





Службу малады лейтэнант будзе несці ў Смалявіцкім РУУС, дзе праходзіў пераддыпломную практыку.

— Нават пакуль і не верыцца, што гады вучобы засталіся ў мінулым, — дзеліцца Уладзіслаў Лемяшонак. — Асабліва ўразіла пачуццё калектывізму, якое раней не было вядомае. Акадэмія навучыла перш за ўсё быць адказным за ўсе справы, за свае ўчынкі.

Маладыя афіцэры працягнуць службу не толькі ў МУС, але і ў Міністэрстве абароны, Следчым камітэце, Дзяржаўным камітэце судовых экспертыз, Дэпартаменце фінансавых расследаванняў Камітэта дзяржкантролю і Дзяржаўным пагранічным камітэце.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
**Фота БелТА.**

---

Тэма

# ЯК ЗМЯНЯЮЦЦА МІГРАЦЫЙНЫЯ ПЛЫНІ

**Транзітны статус Беларусі дае краіне шмат пераваг, але адначасова з тым прыносіць і пэўныя пытанні. Адно з іх — гэта нелегальная міграцыя. Праўда, у якасці канчатковага пункта маршруту нашу краіну такія мігранты разглядаюць рэдка. У асноўным яны імкнуцца патрапіць праз Беларусь у Еўрасаюз. Што да мігрантаў законных, то якраз яны нярэдка просяць прытулку менавіта ў нашай краіне. З радзімы іх прымусілі з'ехаць або вайна, або дрэнныя эканамічныя ўмовы...**

— У нашай краіне створана нацыянальная сістэма прыстанішча, якая адпавядае агульнапрызнаным сусветным стандартам, — адзначыў **начальнік Дэпартамента па грамадзянстве і міграцыі Міністэрства ўнутраных спраў Аляксей БЯГУН.** — Усяго за час рэалізацыі заканадаўства аб вымушанай міграцыі з хадайніцтвамі аб наданні статусу бежанца або дадатковай абароны звярнулася каля 9,5 тысячы замежнікаў з 71 дзяржавы свету. З іх статус бежанца атрымалі 954 чалавекі. Яшчэ прыкладна 4,5 тысячы мы далі дадатковую абарону.

Аляксей Бягун асобна спыніўся на грамадзянах Украіны, якіх выгналі з дому баявыя дзеянні ў Данецкай і Луганскай абласцях і якія просяць прытулку ў Беларусі. Канфлікт там доўжыцца ўжо больш за шэсць гадоў. За гэты час больш за 4 тысячы вымушаных мігрантаў звярнулася з хадайніцтвамі аб дадатковай абароне. Звыш за 3,8 тысячы украінцаў, якія прыбылі з рэгіёнаў, дзе адбываліся баявыя дзеянні, яе атрымалі.

— Акрамя таго, таксама звярталіся з хадайніцтвам аб даванні прыстанішча і дадатковай абароны грамадзяне Расіі, Афганістана, Сірыі, Турцыі, Емена, Камеруна (і іншых стран афрыканскага мацерыка). Не былі выключэннем выхадцы з краін Азіі і Лацінскай Амерыкі.

Міністэрства ўнутраных спраў зрабіла невялікае сацыялагічнае даследаванне бежанцаў, якія папрасілі аб прыстанішчы ў Беларусі. І вынікі яго аказаліся цікавыя. Каля 2/3 ад агульнай колькасці рэспандэнтаў — гэта людзі працаздольнага ўзросту, яшчэ 1/3 — непаўналетнія. І толькі 5 % прыходзіцца на долю людзей пенсійнага ўзросту. З тых, хто знаходзіцца ў працаздольным узросце, 80 % працуюць або вучацца. У 10 разоў меней чалавек знаходзяцца ў адпачынку па доглядзе за дзіцем, пакуль яму не споўніцца тры гады. Цікава, што дзеці пераважна нараджаюцца ўжо на тэрыторыі Беларусі. Яшчэ кожны восьмы чалавек актыўна шукае работу. Такім чынам, можна вывесці сярэднестатыстычны партрэт вымушанага мігранта, які зараз пражывае на тэрыторыі Беларусі. Гэта сямейны чалавек, які знаходзіцца ў працаздольным узросце і недзе працуе.

Але як жа на міграцыйныя плыні паўплывала сітуацыя з распаўсюджваннем каранавіруса, праз якую многія краіны закрылі свае межы да нармалізацыі эпідэміялагічнай абстаноўкі?

— Абмежавальныя захады, якія выкарыстоўвала большасць




дзяржаў еўрапейскага рэгіёна, прывялі да таго, што большасць маршрутаў міжнароднага авіяцыйнага, чыгуначнага і аўтобуснага транспарту была спынена на нявызначаны тэрмін, — заўважае Аляксей Бягун. — Частка бежанцаў не здолела выехаць са сваіх цяперашніх дзяржаў, каб шукаць для сябе новы дом. Геаграфічны складнік пры гэтым практычна не змяніўся. А вось у колькасным вылічэнні ўцекачоў да нас прыбывае меней. Асабліва абмежавальныя захады ўдарылі па нелегальнай міграцыі — гэтая плынь істотна знізілася.

Цікава, што з 16 сакавіка да 15 чэрвеня — ад пачатку часу, калі ў многіх краінах актыўна закрываліся межы, — больш за 2300 іншаземцаў, якія пастаянна пражываюць у Беларусі, звярнулася ў міграцыйныя органы з просьбай падоўжыць тэрмін дзеяння дакументаў, што дазваляюць ім у нас знаходзіцца. Гэтыя людзі не хадайнічалі ў далейшым аб наданні статусу бежанца.

Пры гэтым Міністэрства ўнутраных спраў канстатуе, што нацыянальная сістэма давання прыстанішча працуе ў Беларусі паспяхова.

— Мы вельмі ўдзячныя Упраўленню Вярхоўнага камісара ААН па справах бежанцаў у выбудоўванні беларускай сістэмы прыстанішча, а таксама адраснай дапамогі вымушаным мігрантам. Дзякуючы канструктыўнаму ўзаемадзеянню паміж гэтай структурай, дзяржаўнымі органамі Беларусі і няўрадавымі арганізацыямі ў нашай краіне паспяхова рэалізаваны шэраг праектаў. Яны ахопліваюць шмат сфер. Сярод іх — аказанне прававой, сацыяльнай, медыцынскай і матэрыяльнай дапамогі найбольш уразлівым катэгорыям з ліку асоб, якія шукаюць прыстанішча, а таксама праекты міжнародна-тэхнічнай дапамогі для дзяржаўных і грамадскіх структур. У Беларусі створаны і працуюць тры цэнтры часовага пражывання тых, хто хадайнічае аб наданні статусу бежанца або дадатковай абароны. Яны разлічаны на 60 чалавек, якія з розных прычын не маюць магчымасці свабодна пасяліцца на тэрыторыі нашай краіны. Мы і далей будзем працаваць у гэтым кірунку.

У сваю чаргу, прадстаўнік Упраўлення Вярхоўнага камісара ААН па справах бежанцаў Жан-Іў Бушардзі зазначыў, што цяпер асабліва важныя ўзаемадапамога і адзінства:

— Гэта асабліва бачна праз прызму выклікаў, з якімі сутыкаюцца людзі па ўсім свеце, у тым ліку бежанцы і вымушана перамешчаныя асобы. Я заклікаю кожнага прыкласці ўсе намаганні, каб развіваць гэты глабальны рух салідарнасці і дзеянні. Абсалютна ўсе: дзяржаўныя органы, бізнес-супольнасць, грамадскія арганізацыі, навучальныя ўстановы і кожны з нас паасобку — ва ўсіх ёсць магчымасць дапамагчы, важны любы ўклад. Унёсак у распаўсюджванне каштоўнасцяў інклюзіі, павагі і годнага стаўлення да ўсіх, у тым ліку да бежанцаў, да асоб, якія шукаюць прыстанішча, і асоб без грамадзянства. Мы мацнейшыя, калі працуем разам.

У найбліжэйшы час Беларусь мяркуе далучыцца да Канвенцый ААН аб статусе апатрыдаў 1954 года і аб скарачэнні безграмадзянства 1961 года. Пра гэта стала вядома ў кастрычніку мінулага года.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**
**Фота дадзена Упраўленнем вярхоўнага камісара ААН па справах бежанцаў.**

Па законе

# НЕ ПАКАРАЦЬ, А ДАПАМАГЧЫ

**Жыццёвага досведу ў падлеткаў, як правіла, вельмі мала. І часам бывае, што хлопец ці дзяўчына аступіліся, збочылі па сваёй недасведчанасці «не туды». Але злачынства, якое яны здзейснілі, да разраду цяжкіх не адносіцца. І гэта — далёка не падстава ставіць на іх крыж.**

Раней такія дзеці траплялі на ўлік у дзіцячы пакой міліцыі. Ад гэтага словазлучэння і дагэтуль павявае карным ухілам. Аднак часы мяняюцца. Дзіцячыя пакоі былі рэарганізаваны ў інспекцыі па справах непаўналетніх. Іх задача — зрабіць усё магчымае, каб вярнуць маладога чалавека на правільны рэйкі.

Пра тое, як гэта адбываецца, «Звязда» пагутарыла з **начальнікам аддзела арганізацыі работы інспекцый па справах непаўналетніх упраўлення прафілактыкі галоўнага ўпраўлення аховы правапарадку і прафілактыкі міліцыі грамадскай бяспекі МУС Сяргеем ЯНКОЎСКІМ.**

***— Чым адрозніваецца сучасная інспекцыя па справах непаўналетніх ад колішняга дзіцячага пакоя міліцыі?***

— Зараз вельмі актыўна ідзе пераход ад адміністрацыйна-карных мер да комплекснай сацыяльнай і індывідуальнай прафілактыкі злачынстваў. Мы імкнемся дапамагчы падлетку — ва ўсебаковым развіцці, культурным складніку, аказаць яму псіхалагічную, педагагічную і сацыяльна-прававую падтрымку. Гэта значыць — стварыць усе неабходныя ўмовы для таго, каб падлетак, які аднойчы аступіўся, вярнуўся назад у законапаслухмянае грамадства.

***— Але ці не з'яўляецца трапанне ў спісы інспекцыі своеасаблівай «чорнай меткай»?***

— Хацелася б адзначыць, што «чорную метку», як правільна зазначана, на дзіцяці ў першую чаргу ставіць соцыум. Вось менавіта для выключэння залішняй стыгматызацыі грамадствам Міністэрствам унутраных спраў пры падтрымцы Дзіцячага фонду ААН (ЮНІСЕФ) у Беларусі ў 2020 годзе зняты прафілактычныя ролікі «Мы ніколі не ведаем усёй гісторыі» і «Падлетак». Яны расказваюць пра няпросты лёс дзяцей і заклікаюць ставіцца да іх спагадлівей.

Заканадаўчыя падыходы работы міліцыянераў з падлеткамі былі канцэптуальна зменены ў 2017 годзе, калі прыняліі змяненні ў закон «Аб асновах сістэмы прафілактыкі безнагляднасці і правапарушэнняў непаўналетніх».

Была скасавана пастаноўка на ўлік, як вынік — мы пачалі праводзіць індывідуальную прафілактычную работу з падлеткамі. Звяртаю ўвагу: не ставіць на ўлік у міліцыю, а праводзіць індывідуальную прафілактычную работу. Для яе, у сваю чаргу, скарацііўся пералік катэгорый непаўналетніх. З яго былі выключаны нязначныя правапарушэнні — напрыклад, безбілетны праезд у грамадскім транспарце. Фармальна з падлеткам, які аднойчы праехаў «зайцам», можна было працаваць аж да 18 гадоў. Цяпер жа па ініцыятыве Міністэрства ўнутраных спраў уведзеныя канкрэтныя тэрміны правядзення індывідуальнай прафілактычнай работы, якія не перавышаюць дванаццаці месяцаў. Акрамя таго, такая работа не ўплывае ў далейшым на жыццё падлетка.

Што цікава, сярод «цяжкіх» падлеткаў хлопчыкаў і дзяўчынак прыкладна пароўну. З імі працуюць не толькі міліцыянеры, але і псіхолагі — як школьныя, так і сацыяльна-педагагічных цэнтраў.



***— Якая зараз у нашай краіне назіраецца абстаноўка з падлеткавай злачыннасцю?***

— Аналіз аператыўнай абстаноўкі ў маі 2020 года паказаў, што злачынстваў, якія ўчынілі непаўналетнія, або якія адбыліся з іх удзелам, стала менш на 10 з лішнім працэнтаў. Калі ў абсалютных лічбах, то іх колькасць знізілася з 602 да 540. Але калі паглядзець на асобныя віды злачынстваў, то павялічылася колькасць крадзяжоў. Летась было 231, а цяпер 245. Найбольшы рост іх адзначаны ў Віцебскай, Гомельскай і Мінскай абласцях. Між іншым, крадзяжы — гэта самае распаўсюджанае злачынства сярод падлеткаў. Іх удзельная вага складае каля 45 %.

Вырасла і колькасць махлярстваў — калі іх было за першыя пяць месяцаў мінулага года зарэгістравана 3, то цяпер 10. Але пры гэтым цікава, што ахвярамі непаўналетніх махляроў становяцца не толькі іх аднагодкі, але і дарослыя. Мы сутыкаліся ўжо не раз з тым, што дзеці просяць знаёмых дарослых набыць у растэрміноўку або крэдыт новы дарагі тэлефон. Пры гэтым малы пераконвае, што ён сам будзе плаціць грошы па дамове. І дарослыя, як ні дзіўна, пагаджаюцца! Але вуснамі дзіцяці ісціна тут не гаворыць. Дзе ж ён возьме столькі грошай?

Агульная тэндэнцыя — рост крадзяжоў шляхам выкарыстання камп'ютарнай тэхнікі. Датычна падлеткаў колькасць такіх выпадкаў вырасла з 38 да 61. Адметна, што палова іх прыходзіцца на крадзяжы грошай абанентаў сотавай сувязі праз мабільны банкінг.

Здавалася б, што можа быць падазронага ў тым, што знешне прыстойна апрануты падлетак просіць у вас тэлефон пазваніць ці адправіць паведамленне? Падсвядома трывога не ўзнікае — гэта ж не так званая шпана, якая можа збегчы з вашым апаратам. Але насамрэч такі малы можа мець на ўвазе зусім іншыя мэты.

Як толькі ён атрымлівае доступ да чужога смартфона, ён тут жа актывуе паслугу мабільнага банкінгу. Пры яго дапамозе можна ажыццяўляць грашовыя аперацыі з асабістага рахунку ў аператара і, больш за тое, атрымаць лімітаваную мікрапазыку. Сума, якая паступае на рахунак гаспадару тэлефона, за некалькі секундаў пераводзіцца зламысніку — на яго абаненцкі нумар ці банкаўскі рахунак. За імі могуць адправіцца і ўсе грошы, якія ў гэты момант залічаны на баланс тэлефона. Падлетак вяртае тэлефон — і ў выніку вы мусіце пагашаць мікрапазыку, якую не бралі, плаціць за гэта працэнты ды яшчэ і застаецеся з нулём на ўласным рахунку. Вось такія могуць быць наступствы, здавалася б, з-за бяскрыўднай просьбы.

Па-ранейшаму падлеткі крадуць пластыкавыя карткі і расплачваюцца чужымі грашыма за тавары. Дагэтуль ёсць выпадкі, калі ўладальнікі картак пазначаюць пін-код непасрэдна на пластыку. Але тым самым яны даюць сваімі рукамі злачынцам доступ да грошай. Яшчэ адна памылка — захоўваць пін-код на паперцы ў кашальку побач з карткай. Але і адсутнасць пін-коду — не выратаванне.

Сучасныя карткі дазваляюць рабіць невялікія плацяжы без уводу коду. Як правіла, гаворка звычайна ідзе пра грашовыя велічыні ў 10—20 рублёў. Гэтым і карыстаюцца падлеткі, якія, бывае, знаходзяць згубленыя карткі. Аднак гэта той выпадак, калі жаданне набыць за чужы кошт драбязу прывядзе да крымінальнай справы.

***— З якімі тэндэнцыямі сутыкаюцца інспектары па справах непаўналетніх? Як змяняецца з цягам часу партрэт падлетка, які трапляе ў поле зроку міліцыянераў?***

— Можна сказаць пра тое, што дзеці пачалі «сыходзіць» з вуліц, а ўсё большая частка зносін пераважна адбываецца анлайн. Дапамагаюць у гэтым розныя суполкі ў сацыяльных сетках. Але часам іх магчымасці паварочваюцца на шкодны бок. Ужо не першы год пры дапамозе такіх суполак арганізоўваюцца так званыя «ўпіскі» і «флэты». Гэта вечарыны, якія ладзяцца незнаёмымі паміж сабой людзьмі, якія збіраюцца па аб'явах у віртуальнай прасторы. І такія групы створаны ў большасці гарадоў Беларусі. Напрыклад, у склад мінскай суполкі ўваходзяць звыш 45 тысяч чалавек!

Гэтыя вечарыны праходзяць у кватэрах і катэджах, якія здаюцца ў наём. Іх нязменны атрыбут — распіццё вялікай колькасці спіртнога. У асобных выпадках даходзіць нават да спажывання наркотыкаў. Паколькі ў стане алкагольнага або наркатычнага ап'янення знаходзяцца ў адным месцы раней незнаёмыя маладыя людзі, то паміж імі лёгка разгараюцца канфлікты. Слова за слова — і спрэчкі нярэдка пераходзяць у бойкі, а фіналам чарговай «ўпіскі» становяцца крымінальныя справы.

У сувязі з гэтым я хачу звярнуцца да бацькоў з просьбай больш уважліва ставіцца да паводзін сваіх дзяцей, цікавіцца, дзе яны бавяць час і, галоўнае, з кім.

***— Як падапечныя інспектараў уключаюцца ў грамадска-масавую, спартыўную работу?***

— Мы ўжо казалі вышэй, што зараз востра стаіць праблема бяспекі дзяцей у інтэрнэце. Зыходзячы з гэтага, неабходна фарміраванне ў іх уяўленняў аб віртуальным і рэальным свеце. Мы ідзём у нагу з часам і распрацоўваем новыя падыходы, якія дазваляюць не толькі навучыць дзіця бяспечным паводзінам, але і зацікавіць яго, арганізаваўшы вольны час. Напрыклад, шмат прафілактычнай інфармацыі распаўсюджваецца намі праз паблікі ў сацыяльных сетках. Яна скіравана як на бацькоў, так і на дзяцей. Але просім і ўсіх неабыякавых людзей падключыцца да гэтай работы, каб абмеркаваць надзённыя праблемы і ўнесці свае прапановы.

Асаблівай увагі патрабуюць падлеткі, з якімі інспекцыі па справах непаўналетніх праводзяць індывідуальную прафілактычную работу. Наша задача — не пакараць, а дапамагчы атрымаць належнае выхаванне.

Таму мы актыўна ўключаем «цяжкіх» падлеткаў у турыстычныя паходы і злёты, экскурсіі з наведваннем помнікаў гісторыі і культуры Беларусі, турніры па розных відах спорту, у якіх удзельнічаюць каманды з ліку супрацоўнікаў інспекцыі па справах непаўналетніх. І ім гэта вельмі падабаецца! У якасці прыкладу можна прывесці рэспубліканскі спартыўна-дабрачынны праект «Смелы крок», арганізаваны сёлета Міністэрствам унутраных спраў ва ўзаемадзеянні з Прэзідэнцкім спартыўным клубам і Беларускай федэрацыяй кікбоксінга. У праекце ўдзельнічала 150 дзяцей з Мінскай, Віцебскай, Гомельскай і Магілёўскай абласцей, а таксама Мінска. Заняткі арганізуюцца на базе спартыўных залаў аддзелаў унутраных спраў пры дапамозе прафесійных трэнераў.

Добрыя справы

## ЗНАЙШЛІ ЧАЛАВЕКА

Раніцай 26 чэрвеня ў Брэсце на скрыжаванні дзвюх вуліц — Маскоўскай і Фруктовай — на праезнай частцы ляжаў пажылы мужчына. Пасля таго як пра гэта паведамілі ў дзяжурную часць ДАІ УУС Брэсцкага аблвыканкама, на месца падзей адправіліся інспектары. Яны ўбачылі, што дзядуля сядзіць каля тратуара і выглядае вельмі разгублена. Інспектары прапанавалі мужчыну дапамогу — падвезці яго дадому. Пенсіянер адгукнуўся з радасцю, але... дакладнага адраса пражывання не памятаў. На шчасце, у адным з двароў яго пазналі суседкі, якія і падказалі дакладную кватэру, дзе ён жыве.

Дзверы адчыніла жонка. Яна і паведаміла ашаламляльную навіну. Аказалася, што яе муж сышоў два дні таму з дому. Куды — невядома. Сама яна моцна разгубілася і не ведала, што рабіць. Жанчына доўга дзякавала інспектарам ДАІ за іх дапамогу.

## РЫЗЫКОЎНАЕ КУПАННЕ

Вечар мінулай пятніцы выдаўся ў Мінску вельмі душны і спякотны. Людзі пацягнуліся на адпачынак да вады, але... не ўсе з іх зважалі на правілы бяспекі. На канале Сляпянскай воднай сістэмы купацца забаронена ўвесь час. Гэта не стала перашкодай для аднаго з мужчын, які вырашыў у ім асвяжыцца на тэрыторыі аднаго са сталічных паркаў. Тое, што чалавек тоне, убачыў сяржант міліцыі Максім Карнільчык. Ён тут жа кінуўся ў ваду, дастаў чалавека і аказаў яму першую медыцынскую дапамогу. Неабачлівага адпачывальніка перадалі медыкам.

## ВЫРАТАВАНЫ НОВАНАРОДЖАНЫ

Раніцай 21 чэрвеня нарад інспектараў ДАІ Заводскага РУУС ехаў па Партызанскім праспекце. Каля станцыі метро «Магілёўская» стаяў легкавік, міргаючы аварыйным святлом. Раптам насустрач патрулю выбег мужчына — як пазней аказалася, ён быў кіроўцам машыны, якая зламалася. Ён расказаў пра тое, што склалася крытычная сітуацыя — у аўтамабілі задыхаецца нованароджаная дзіця, а брыгада хуткай медыцынскай дапамогі пакуль яшчэ не прыбыла.

Інспектары ДАІ прапанавалі пад'ехаць мужчыну разам з малым да найбліжэйшай бальніцы. Яны ўключылі пробліскавыя маячкі і гукавую сігналізацыю і паехалі ў напрамку да медыцынскай установы. Праехаўшы адлегласць у адзін перагон метро, яны ўбачылі, што насустрач едзе машына «хуткай». Міліцыянеры тут жа перадалі малога медыкам, якія аказалі яму неадкладную дапамогу.

Без наркотыкаў

# У ПАЛОНЕ ДУРМАНУ

**Праваахоўнікі з пачатку года спынілі 15 каналаў пастаўкі наркотыкаў у Беларусі, столькі ж было выяўлена памяшканняў для вырошчвання наркатычных раслін. Пра гэта БелТА паведамілі ў галоўным упраўленні па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі Міністэрства ўнутраных спраў.**

«Назіраецца тэндэнцыя зніжэння колькасці зарэгістраваных злачынстваў, звязаных з незаконным абаротам наркотыкаў. Колькасць перадазіровак, дапушчаных непаўналетнімі, знізілася за шэсць апошніх гадоў у 56 разоў, а апошні выпадак смерці непаўналетніх ад наркотыкаў зарэгістраваўся ў краіне ў 2014 годзе», — расказаў **начальнік галоўнага ўпраўлення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі МУС Алег СІЛЬВЕСТРОВІЧ.**

Па выніках пяці месяцаў бягучага года, органы ўнутраных спраў выявілі больш за 1,5 тысячы нарказлачынстваў, гэта на 28 % менш, чым за такі ж перыяд мінулага года. Каля паловы злачынстваў звязаны са збытам. Непаўналетнія і з іх удзелам здзейснілі на 75 нарказлачынстваў менш, на 26 % знізіўся ўзровень рэцыдыўнай нарказлачыннасці.

«Асноўныя намаганні органаў унутраных спраў па-ранейшаму сканцэнтраваны на выяўленні і спыненні каналаў паставак наркотыкаў у краіну з-за мяжы, а таксама іх транзітных перавозак. Толькі за мінулы перыяд іх выяўлена 15», — удакладнілі ва ўпраўленні.

Нягледзячы на стабільную і кантраляваную сітуацыю, наркапагроза ў краіне захоўваецца. Змяненне кан'юнктуры наркарынку разам з бескалпотнасцю наркаспажыўцоў прыводзяць да павелічэння перадазіровак, у тым ліку са смяротным зыходам.

Аналіз даных наркакантролю паказвае, што смерці ад перадазіровак у большасці выпадкаў звязаны з ужываннем метадону. Толькі ў гэтым годзе з-за яго загінуў 21 чалавек, а 14 памерлі ад перадазіроўкі метадону ў спалучэнні з іншымі псіхаактыўнымі рэчывамі. «У асноўным гэта асобы старэйшыя за 30 гадоў, так званыя нарказалежныя са стажам, раней судзімыя, у тым ліку па арт. 328 КК, якія стаялі на ўліку ва ўрача-нарколага, а таксама якія накіроўваліся на прымусовае лячэнне ад наркаманіі і алкагалізму», — растлумачылі ва ўпраўленні.

**Матэрыялы паласы падрыхтаваў Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

# ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «Всё в дом!»

**1. Организатор Рекламной игры**: ООО «Дачмедиа», адрес: 220004, г. Минск, пр-т Победителей, 7А-73, УНП 192208517. Зарегистрировано Минским горисполкомом Республики Беларусь решением от 5 февраля 2014 года в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 192208517.

**2. Заинтересованные лица:**

- Открытое акционерное общество «Керамин»: 220024, г. Минск, ул. Серова, 22, УНП 100297103.

- Торговое унитарное предприятие «Керамин-Столица Инвест»: 220024, г. Минск, ул. Осиповичская, д. 16-2, к. 10, УНП 191437310.

- Унитарное предприятие «Торговый дом «Керамин-Буг»: 224020, г. Брест, ул. Московская, 202, УНП 290476469.

- Унитарное предприятие «Торговый дом «Керамин-Запад»: 230001, г. Гродно, ул. Соколовского, 20, УНП 590683525.

- Унитарное предприятие «Торговый дом «Керамин-Двина»: 210033, г. Витебск, ул. Ленинградская, 17, УНП 390401499.

- Унитарное предприятие «Торговый дом «Керамин-Днепр», 212027, г. Могилев, ул. Островского, 36, УНП 790321372.

- Унитарное предприятие «Торговый дом «КЕРАМИН-СОЖ», 246029, г. Гомель, пр-т Октября, 29а, УНП 490557934.

- Унитарное предприятие «Торговый дом «Керамин-Мозырь», 247760, г. Мозырь, бульвар Страконицкий, 24а, УНП 490806869.

- СООО «Хенкель Баутехник», ул. Строительная 1, к. 1, 223036, г. Заславль, Минская обл., УНП 690314863.

**3. Наименование Рекламной игры**: «Всё в дом!».

**4. Территория проведения Рекламной игры**: Рекламная игра проводится в торговой сети магазинов «Керамин», расположенных на территории Республики Беларусь по следующим адресам:

**1.** г. Минск, ул. Осиповичская, 18
**2.** г. Минск, пр-т Независимости, 46
**3.** г. Минск, ул. Космонавтов, 27
**4.** г. Минск, ул. Тимирязева, 123/2, ТРЦ «Град»
**5.** г. Минск, ул. Притыцкого, 97
**6.** г. Минск, ул. Уручская, 21
**7.** г. Барановичи, ул. Комсомольская, 5
**8.** г. Молодечно, ул. Великий Гостинец, 67 Г
**9.** г. Солигорск, ул. К. Заслонова, 20а
**10.** г. Могилев, ул. Якубовского, 90-93
**11.** г. Могилев, ул. Островского, 36а
**12.** г. Бобруйск, ул. Гоголя, 16
**13.** г. Витебск, ул. Ленинградская, 17
**14.** г. Гомель, пр-т Октября, 29а
**15.** г. Гомель, ул. Хатаевича, 33а
**16.** г. Мозырь, бульвар Страконицкий, 24а
**17.** г. Гродно, ул. Мостовая, 39
**18.** г. Лида, ул. Советская, 1
**19.** г. Брест, ул. Московская, 202
**20.** г. Пинск, ул. Рокоссовского, 15
**21.** г. Горки, ул. Ленина, д. 26/1,

а также в интернет-магазинах «Керамин» www.keramin.by, www.vitebsk.keramin.by, www.mogilev.keramin.by, www.gomel.keramin.by, www.brest.keramin.by, www.grodno.keramin.by.

**5. Срок начала и окончания Рекламной игры**, включая срок выдачи выигрышей и публикации результатов проведения Рекламной игры: с 01.07.2020 г. по 21.10.2020 г включительно.

**6. Период, в течение которого можно стать участником Рекламной игры**: с 1 июля 2020 г. по 31 августа 2020 г. включительно.

**7. Состав комиссии** по проведению Рекламной игры (далее – комиссия):

Председатель комиссии: Воронова Елена Леонидовна, начальник управления маркетинга унитарного предприятия «Керамин-Столица Инвест».

Члены комиссии:

- Поправко Татьяна Анатольевна, начальник отдела организации закупок и продвижения унитарного предприятия «Керамин-Столица Инвест»;
- Кишко Ольга Геннадьевна, начальник службы маркетинга СООО «Хенкель Баутехник»;
- Гладкая Мария Дмитриевна, специалист по маркетингу ООО «Дачмедиа»;
- Михалевич Анна Александровна, специалист по маркетингу ООО «Дачмедиа».

**8. Участники Рекламной игры**:

к участию в Рекламной игре допускаются совершеннолетние (достигшие возраста 18 лет), постоянно проживающие в Республике Беларусь граждане Республики Беларусь, а также иностранные граждане и лица без гражданства, постоянно проживающие в Республике Беларусь. Участником Рекламной игры не может быть член комиссии по проведению Рекламной игры, а также лицо, состоящее в трудовых отношениях с Организатором, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства.

**9. Наименование товаров, в целях стимулирования реализации которых проводится Рекламная игра**:

Рекламная игра проводится в целях стимулирования реализации всех товаров (за исключением продукции, выпускаемой под торговыми марками «LUX» и «Тайфун»), реализуемых в розничных торговых объектах «Керамин», указанных в пункте 4 настоящих Правил, с обязательной покупкой Игрового продукта, а именно:

**Игровой продукт** – товар, выпускаемый под товарным знаком «Ceresit», а именно любой продукт из нижеприведенного списка:

- Растворная смесь сухая, облицовочная, цементная Ceresit CM 10, 25 кг
- Растворная смесь сухая, облицовочная, цементная Ceresit CM 11 PLUS, 25 кг
- Растворная смесь сухая, облицовочная, цементная Ceresit CM 12, 25 кг
- Растворная смесь сухая, облицовочная, цементная Ceresit CM12 Express 25 кг
- Растворная смесь сухая, облицовочная, цементная Ceresit CM 14, 25 кг
- Растворная смесь сухая, облицовочная, цементная Ceresit CM 16, 25 кг
- Растворная смесь сухая, облицовочная, цементная Ceresit CM 115, 25 кг.

**10. Порядок участия в Рекламной игре:**

**10.1.** Для участия в Рекламной игре необходимо в период с 1 июля 2020 г. по 31 августа 2020 г. включительно:

- совершить покупку в розничных торговых объектах «Керамин» или интернет-магазинах «Керамин», указанных в п. 4, на сумму не менее 250,00 (двухсот пятидесяти) белорусских рублей в одном чеке (в сумму покупки, необходимой для участия, не входит продукция, выпускаемая под торговыми марками «LUX» и «Тайфун»), включая как минимум один Игровой продукт;
- получить карточку (-ки) с игровым кодом (далее – «Игровой код») у кассира при покупке в торговом объекте «Керамин», у курьера в момент доставки продукции, заказанной в интернет-магазине, либо у кладовщика в момент забора продукции, оплаченной с помощью систем ЕРИП и WebPay, заказанной в интернет-магазине. Каждый участник получает столько Игровых кодов для участия в Рекламной игре, сколько единиц Игрового продукта в кассовом чеке при покупке в торговом объекте «Керамин» и по 2 (два) Игровых кода на каждую единицу Игрового продукта при покупке в интернет-магазине;
- зарегистрировать полученный Игровой код на сайте keramin.by/igra (далее – «Сайт») для участия в Рекламной игре, выданный на кассе торгового объекта «Керамин», либо курьером в момент доставки продукции, заказанной в интернет-магазине, либо кладовщиком в момент забора продукции, оплаченной с помощью систем ЕРИП и WebPay, заказанной в интернет-магазине. Указать ФИО, контактный номер телефона, e-mail, город, в котором приобретался товар, номер кассового чека, уникальный код покупки, и нажать кнопку «Зарегистрировать». Совершая указанные выше действия, участник дает согласие на участие в Рекламной игре и использование Организатором его данных (ФИО, номер телефона, e-mail, паспортные данные), а также подтверждает ознакомление с настоящими Правилами.

**10.2.** К моменту розыгрыша Призов из Участников, выполнивших условия Рекламной игры и зарегистрировавшихся на Сайте, Организатором формируется список для розыгрыша. Организатор присваивает каждому Игровому коду один индивидуальный порядковый номер, начиная с 00001 и выше, по дате и времени регистрации Участником Игрового кода покупки (далее – «Игровой номер»). Если дата и время регистрации Игрового кода на Сайте разных Участников Рекламной игры совпадают, то более ранний Игровой номер присваивается тому Участнику, совершившего покупку, фамилия которого следует в алфавитном порядке раньше.

**10.3.** Каждый Участник может принимать участие в Рекламной игре неограниченное количество раз при условии совершения каждый раз покупки на сумму не менее 250,00 (двухсот пятидесяти) белорусских рублей (в сумму покупку, необходимой для участия, не входит продукция, выпускаемая под торговыми марками «LUX» и «Тайфун») и наличия Игрового продукта в чеке, а также выполнения требований, необходимых для участия в Рекламной игре.

**10.4.** В случае полного возврата товара, приобретенного для участия в Рекламной игре, до проведения розыгрыша, Игровой код аннулируется из базы регистрации и в розыгрыше не участвует. В случае частичного возврата товара, приобретенного для участия в Рекламной игре, до проведения розыгрыша, Игровой код участвует в розыгрыше при соблюдении условий, указанных в п.10.1 настоящих правил.

**10.5.** Необходимо сохранить оригинал чека, подтверждающего покупку, до срока окончания Рекламной игры.

**11. Состав, размер призового фонда и источники его формирования:**

**11.1.** Призовой фонд Рекламной игры сформирован за счет денежных средств Заинтересованных лиц (СООО «Хенкель Баутехник», Открытое акционерное общество «Керамин», унитарное предприятие «Керамин-Столица Инвест», унитарное предприятие «Торговый дом «Керамин-Буг», унитарное предприятие «Торговый дом «Керамин-Запад», унитарное предприятие «Торговый дом «Керамин-Двина», унитарное предприятие «Торговый дом «Керамин-Днепр», унитарное предприятие «Торговый дом «КЕРАМИН-СОЖ», унитарное предприятие «Торговый дом «Керамин-Мозырь»), а также денежных средств и имущества Организатора, в размере 19 290,94 белорусского рубля.

**11.2.** Призовой фонд Рекламной игры включает в себя призы, перечисленные ниже в Таблице № 1 (Состав Призового Фонда):

*Таблица № 1. Состав Призового Фонда*

| № | Наименование Приза | Количество | Стоимость за ед., бел. рублей | Итого, бел. рублей |
|---|---|---|---|---|
| | **Телевизор 65" LCD «Samsung»** | | | |
| 1 | Телевизор 65" LCD «Samsung» [UE65TU7160U]; 4K UltraHD (3840x2160), Wi-Fi, Smart TV и | 2 | 2176,15 | 5002,64 |
| | Денежные средства, которые удерживаются Организатором и используются для уплаты за Победителя подоходного налога от стоимости приза<br>Далее – «Телевизор» | | 325,17 | |
| | **Ноутбук Dell Inspiron 3583-2877** | | | |
| 2 | Ноутбук Dell Inspiron 3583-2877 (P75F) i5-8265-U/15"FHD/8G/SSD 256/UHD620/Windows 10 и | 2 | 1528,50 | 3513,80 |
| | Денежные средства, которые удерживаются Организатором и используются для уплаты за Победителя подоходного налога от стоимости приза<br>Далее – «Ноутбук» | | 228,40 | |
| | **Кофемашина Philips EP3243/70** | | | |
| 3 | Кофемашина Philips EP3243/70 и | 2 | 1542,61 | 3546,22 |
| | Денежные средства, которые удерживаются Организатором и используются для уплаты за Победителя подоходного налога от стоимости приза<br>Далее – «Кофемашина» | | 230,50 | |
| | **Планшет Lenovo TB-X505L** | | | |
| 4 | Планшет Lenovo TB-X505L (ZA4H0012UA) и | 6 | 471,65 | 3252,78 |
| | Денежные средства, которые удерживаются Организатором и используются для уплаты за Победителя подоходного налога от стоимости приза<br>Далее – «Планшет» | | 70,48 | |
| | **Мультиварка REDMOND** | | | |
| 5 | Мультиварка REDMOND RMC-IHM302 и | 6 | 324,23 | 2236,08 |
| | Денежные средства, которые удерживаются Организатором и используются для уплаты за Победителя подоходного налога от стоимости приза<br>Далее – «Мультиварка» | | 48,45 | |
| | **СТЕКЛООЧИСТИТЕЛЬ KARCHER** | | | |
| 6 | Стеклоочиститель Karcher WV 6 Plus 1.633-510.0 и | 4 | 252,21 | 1159,60 |
| | Денежные средства, которые удерживаются Организатором и используются для уплаты за Победителя подоходного налога от стоимости приза<br>Далее – «Стеклоочиститель» | | 37,69 | |
| | **СТЕКЛООЧИСТИТЕЛЬ KARCHER** | | | |
| 7 | Стеклоочиститель Karcher WV 6 Plus 1.633-510.0 и | 2 | 252,22 | 579,82 |
| | Денежные средства, которые удерживаются Организатором и используются для уплаты за Победителя подоходного налога от стоимости приза<br>Далее – «Стеклоочиститель» | | 37,69 | |

**12. Место, дата, время и порядок проведения розыгрыша призового фонда, в том числе порядок определения Победителей:**

**12.1.** Розыгрыши призов проводятся в салоне керамической плитки и санитарной керамики «Керамин» по адресу: г. Минск, ул. Осиповичская, 18 согласно Таблице № 2 Розыгрыши Призов.

**12.2.** Порядок проведения розыгрышей и порядок определения победителей, участвующих в розыгрыше Призов:

**12.2.1.** Все завернутые бумажки так, чтобы их нельзя было прочесть, с написанными Игровыми номерами Участников, участвующих в Текущем розыгрыше (см. Таблицу № 2 Розыгрыши Призов), засыпаются в лототрон и перемешиваются, объявляется разыгрываемый приз, затем один из членов комиссии достает из лототрона 1 (Один) Игровой номер – так определяется победитель. Данная процедура проводится для определения всех Победителей всех розыгрышей призов. Призовой фонд разыгрывается в последовательности, указанной в Таблице № 2.

**12.2.2.** После определения победителей розыгрыша для обеспечения полной выдачи призов Организатор формирует список резервных победителей путем прибавления 1 (единицы) к Игровому номеру каждого победителя. Таким образом, резервными победителями следует считать Участников, Игровые номера которых следуют за Игровыми номерами победителей. В случае если Игровые номера победителей следуют друг за другом, резервными победителями следует считать участников, Игровые номера которых следуют за выигрышными.

Все игровые коды Участников после розыгрыша изымаются в присутствии Комиссии, опечатываются и отдаются на хранение Организатору.

**12.2.3.** Результат каждого Розыгрыша в обязательном порядке фиксируется в протоколе розыгрышей, подписанном присутствующими на заседании членами комиссии.

*Таблица № 2. Розыгрыши Призов*

| Дата и время проведения Розыгрыша | Участвуют Игровые коды Участников, которые совершили покупку и подтвердили свое участие в игре, зарегистрировавшись на Сайте в период | Призовой фонд Розыгрыша | |
|---|---|---|---|
| | | Наименование Приза | Количество, шт. |
| **Розыгрыш № 1** | | | |
| 9 июля 2020 года, 12.00 | С 1 июля 2020 г. по 7 июля 2020 г. (включительно) | **Планшет** | 1 |
| | | **Мультиварка** | 1 |
| | | **Стеклоочиститель** | 1 |
| **Розыгрыш № 2** | | | |
| 16 июля 2020 года, 12.00 | С 8 июля 2020 г. по 14 июля 2020 г. (включительно) | **Планшет** | 1 |
| | | **Мультиварка** | 1 |
| | | **Стеклоочиститель** | 1 |
| **Розыгрыш № 3** | | | |
| 23 июля 2020 года, 12.00 | С 15 июля 2020 г. по 21 июля 2020 г. (включительно) | **Планшет** | 1 |
| | | **Мультиварка** | 1 |
| | | **Стеклоочиститель** | 1 |
| **Розыгрыш № 4 (месячный)** | | | |
| 30 июля 2020 года, 12.00 | С 1 июля 2020 г. по 28 июля 2020 г. (включительно) | **Телевизор** | 1 |
| | | **Ноутбук** | 1 |
| | | **Кофемашина** | 1 |
| **Розыгрыш № 5** | | | |
| 6 августа 2020 года, 12.00 | С 29 июля 2020 г. по 4 августа 2020 г. (включительно) | **Планшет** | 1 |
| | | **Мультиварка** | 1 |
| | | **Стеклоочиститель** | 1 |
| **Розыгрыш № 6** | | | |
| 13 августа 2020 года, 12.00 | С 5 августа 2020 г. по 11 августа 2020 г. (включительно) | **Планшет** | 1 |
| | | **Мультиварка** | 1 |
| | | **Стеклоочиститель** | 1 |
| **Розыгрыш № 7** | | | |
| 20 августа 2020 года, 12.00 | С 12 августа 2020 г. по 18 августа 2020 г. (включительно) | **Планшет** | 1 |
| | | **Мультиварка** | 1 |
| | | **Стеклоочиститель** | 1 |
| **Розыгрыш № 8 (месячный)** | | | |
| 02 сентября 2020 года, 12.00 | С 29 июля 2020 г. по 31 августа 2020 г. (включительно) | **Телевизор** | 1 |
| | | **Ноутбук** | 1 |
| | | **Кофемашина** | 1 |

**13. Порядок уведомления победителей (резервных победителей) о результатах Рекламной игры, порядок получения выигрыша.**

**13.1.** Победители (резервные победители) Розыгрышей извещаются Организатором о выигрыше сообщением, отправляемым на адрес электронной почты, указанной при регистрации на Сайте, в сроки, определенные в Таблице № 3. Организатор также оставляет за собой право дополнительно уведомлять победителей (резервных победителей) любым удобным ему способом: посредством звонка и (или) SMS-рассылки на указанные при регистрации на Сайте номера мобильных телефонов.

*Таблица № 3*

| Срок уведомления победителей | Срок получения призов победителями путем самовывоза | Срок уведомления резервных победителей | Срок получения призов резервными победителями путем самовывоза | Срок получения призов победителями (резервными победителями) в магазинах «Керамин» |
|---|---|---|---|---|
| В течение 7 (семи) календарных дней после проведения каждого розыгрыша Призов | По 16.09.2020 включительно | По 23.09.2020 включительно | По 07.10.2020 включительно | По 21.10.2020 включительно |

**13.2. Порядок получения Призов:**

13.2.1. Для победителей (резервных победителей), проживающих в г. Минске, или не проживающих в г. Минске, но желающих получить Приз путем самовывоза из офиса организатора по адресу: г. Минск, пр-т Победителей, 7А-73, необходимо явиться с 10.00 до 18.00 в период со дня следующего за проведением розыгрыша, и по 16.09.2020 г. (включительно) (для победителей), и в период со дня уведомления резервного победителя о выигрыше по 07.10.2020 г. (включительно) (для резервных победителей), кроме субботы, воскресенья и государственных праздничных дней. А также в субботу 12.09.2020 г. (для победителей) и в субботу 03.10.2020 г. (для резервных победителей) в период с 10.00 до 13.00.

13.2.2. Для победителей (резервных победителей), проживающих не в г. Минске: не позднее 16.09.2020 г. (для победителей) и не позднее 07.10.2020 г. (для резервных победителей) необходимо связаться с Организатором по телефону +375 17 221 00 12 и проинформировать, в каком магазине «Керамин» они хотели бы забрать свои призы.

13.2.3. После получения вышеуказанной информации Организатор в срок до 14.10.2020 г. передает призы в магазины «Керамин», где Победители (резервные победители) могут забрать свои призы по 21.10.2020 г. включительно.

13.2.4. Для получения призов при себе необходимо иметь паспорт (или вид на жительство) и оригинал чека, подтверждающего покупку. В случае если Победители (резервные победители) не забрали свои Призы в офисе Организатора в срок до 18.00 07.10.2020 года или в магазине «Керамин» в срок до 18.00 21.10.2020 г., их выигрыш остается в распоряжении Организатора.

13.3. Призы вручаются резервным победителям в случае если основной победитель:

13.3.1. отказывается от получения приза, о чем письменно извещает Организатора в срок по 16.09.2020 г. включительно;

13.3.2. указал недостоверную информацию на Сайте;

13.3.3. нарушает (не выполняет) условия Правил, в том числе не представляет необходимые подтверждающие документы, указанные в Правилах, в сроки и в порядке, установленные Правилами;

13.3.4. не выходит на связь с Организатором и не является для получения приза в срок по 16.09.2020 г. включительно;

13.3.5. отказывается от подписания документов, фиксирующих факт выдачи приза, и иных документов, связанных с участием в Игре.

**13.3**. В соответствии с главой 16 Налогового кодекса Республики Беларусь Организатор при вручении Приза удерживает у Победителя (резервные победители) из денежной части приза и перечисляет в бюджет подоходный налог в установленном порядке.

**13.4**. Организатор не оплачивает Участникам Рекламной игры расходы, связанные с проездом к месту получения Призов.

**13.5**. В случае если Победитель (резервный победитель) не может получить Приз лично, Приз может получить его доверенное лицо по предъявлении своего паспорта (вида на жительство), доверенности от Победителя (резервного победителя), заверенной нотариально и оригинала чека.

**13.6.** Победитель (резервный победитель) при получении Приза письменно подтверждает факт его получения, заполняет все необходимые документы, представленные Организатором, связанные с получением Приза.

**13.7.** Призы не подлежат замене. Выплата денежного эквивалента Призов не осуществляется. Ответственность Организатора по выдаче Призов ограничена исключительно вышеуказанным количеством и видами этих Призов.

**13.8.** Организатор Рекламной игры не несет ответственности за любые риски, связанные с повреждением Призов и их эксплуатацией, возникшие после передачи Призов Победителям (резервным победителям).

**14. Прочие условия:**

**14.1.** Участие в Рекламной игре предполагает ознакомление и полное согласие Участников с настоящими Правилами и принятие на себя обязательства соблюдать все их условия и требования.

**14.2.** Факт участия в Рекламной игре означает, что ее Участники соглашаются с тем, что их имена, отчества, фамилии, фотографии, видео-, аудио- и иные материалы о них могут быть использованы Организатором в любых рекламных и (или) информационных материалах, связанных с проведением Рекламной игры, без уплаты какого-либо вознаграждения Участникам. Победители (резервные победители) Рекламной игры дают свое согласие на интервью в средствах массовой информации и съемку для рекламных материалов, подготовленных в связи с проведением данной Рекламной игры, без выплаты им какого-либо вознаграждения. Все права на такие рекламные материалы принадлежат Организатору.

**14.3. Организатор не несет ответственности за:**

**14.3.1.** Ошибки, допущенные Участниками Рекламной игры и за достоверность сведений и личных данных, указанных в анкете.

**14.3.2.** Невозможность связаться с Участником в случае недостоверности информации предоставленной Участником.

**14.3.3.** Невыполнение (несвоевременное выполнение) Участниками обязанностей, связанных с участием в Рекламной игре и получением призов.

**14.3.4.** Неознакомление Участников с настоящими Правилами и условиями участия в Рекламной игре, а равно их неознакомление с результатами проведения Рекламной игры.

**14.3.5.** Неполучение от Участников документов, необходимых для получения призов (паспорта или вида на жительство и оригинала чека, подтверждающего покупку).

**15. Информация о Рекламной игре, публикация Правил Рекламной игры.**

**15.1.** Правила Рекламной игры публикуются в газете «Звязда» до начала ее проведения.

**15.2.** Результаты Рекламной игры (включающие сведения об организаторе, наименование Рекламной игры; срок начала и окончания Рекламной игры; сведения о государственной регистрации Рекламной игры; сведения о количестве участников Рекламной игры; сведения о полном или частичном розыгрыше призового фонда; фамилию, инициалы победителя (победителей), его выигрыш (их выигрыши)); телефон для справок по вопросам проведения Рекламной игры) будут опубликованы в газете «Звязда» 17.09.2020 г.

**15.3.** Телефон для справок по вопросам проведения Рекламной игры: +375 44 5 888 777 в рабочие дни с 08.00 до 21.00, в выходные дни с 09.00 до 20.00 часов. Звонок платный, в соответствии с тарифами операторов, которыми пользуется Участник.

**15.4.** Споры между Организатором и Участниками Рекламной игры рассматриваются в соответствии с законодательством Республики Беларусь.

**15.5.** Все возможные претензии Участников Рекламной игры в отношении организации Рекламной игры должны быть адресованы Организатору по адресу: Республика Беларусь, г. Минск, пр-т Победителей, 7А-73.

Свидетельство № 3805 о регистрации Рекламной игры, зарегистрированной 26 июня 2020 г., выдано Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.

# Палеміка павінна быць прыстойнай

## За абразы ў інтэрнэце прадугледжана адказнасць аж да крымінальнай

Аб гэтым падчас брыфінгу нагадаў **выконваючы абавязкі начальніка аддзела па наглядзе за выкананнем правоў і свабод грамадзян Генеральнай пракуратуры Беларусі Павел ЕЛІСЕЕЎ.**

«Апошнім часам назіраецца значнае павелічэнне колькасці зваротаў грамадзян у органы ўнутраных спраў і непасрэдна ў Міністэрства ўнутраных спраў са скаргамі на некарэктную крытыку, публічнае цкаванне, абразы і пагрозы за выказванне сваёй пазіцыі па розных пытаннях грамадска-палітычнага жыцця дзяржавы, якія размяшчаюцца на розных інтэрнэт-рэсурсах, у тым ліку праз сацыяльныя сеткі», — адзначыў пракурорскі работнік.

Ён падкрэсліў, што сітуацыя, якая склалася, стала магчымай у выніку памылковага ўяўлення і ўспрымання сеткі Інтэрнэт як тэрыторыі ўсёдазволенасці, а ананімнага фармату зносін — як гарантыі беспакаранасці за пэўныя нядобрыя дзеянні.

«Генеральная пракуратура заўсёды зыходзіла і зыходзіць з таго, што грамадзяне незалежна ад іх палітычных перакананняў і прыхільнасцяў маюць роўныя правы на публічнае выказванне свайго меркавання, сваёй пазіцыі. У перыяд выбарчых кампаній палеміка і абмен думкамі могуць дасягаць асаблівага напружання. Але гэта нармальны працэс для любой дэмакратычнай дзяржавы. Аднак спадарожнай умовай такой свабоды з'яўляецца перш за ўсё прытрымліванне элементарнай культуры зносін — калі дыскусія ці абмен думкамі не пераходзяць межы прыстойнасці альбо закона. Публічныя паклёп, абразы ў сетцы Інтэрнэт не толькі непрымальныя, але праследуюцца па законе. За падобныя дзеянні можа наступаць крымінальная, адміністрацыйная і грамадзянска-прававая адказнасць», — папярэдзіў Павел Елісееў.

У прыватнасці, удакладніў выконваючы абавязкі начальніка аддзела, распаўсюджванне заведама непраўдзівых звестак, якія няслаўяць іншую асобу, паклёп у сродках масавай інфармацыі, інтэрнэце ці іншай сетцы электрасувязі, а таксама паклёп, які ўтрымлівае абвінавачванні ў здзяйсненні цяжкага ці асабліва цяжкага злачынства, акрамя штрафу можа карацца арыштам ці абмежаваннем свабоды да трох гадоў. Аналагічныя санкцыі прадугледжаны за наўмыснае прыніжэнне гонару і годнасці асобы, выказаныя ў непрыстойнай форме (абразу праз распаўсюджванне такіх звестак у СМІ ці інтэрнэце).

Разважшчэнне на электронных рэсурсах пагроз прычынення шкоды жыццю, здароўю грамадзян ці іх маёмасці таксама цягне крымінальны пераслед, паколькі робіць замах на асноўныя правы — на жыццё, здароўе, недатыкальнасць асабістай уласнасці. Такія дзеянні прадугледжваюць максімальнае пакаранне ў выглядзе пазбаўлення свабоды тэрмінам да трох гадоў.

«Генеральная пракуратура заклікае абдумана і ўзважана падыходзіць да рэалізацыі свайго права на свабоднае выказванне меркавання, не дапускаць дзеянняў, якія парушаюць правы іншых асоб, незалежна ад палітычных перакананняў, сацыяльнай і прафесійнай прыналежнасці апошніх. Разгляданне органамі ўнутраных спраў зваротаў і скаргаў грамадзян па гэтай тэматыцы знаходзіцца на асаблівым кантролі Генеральнай пракуратуры. Пры пацвярджэнні фактаў парушэння закона будуць прымацца меры рэагавання, а вінаватыя асобы будуць прыцягвацца да адказнасці, устаноўленай законам. Узаемная павага правоў і свабод кожнага члена грамадзянскай супольнасці разам з прынцыповай пазіцыяй праваахоўных органаў дазволіць папярэджваць і аператыўна рэагаваць на факты парушэння правоў і свабод грамадзян», — абазначыў пазіцыю Генеральнай пракуратуры Павел Елісееў.

Па яго словах, па стану на ўчарашні дзень у органы ўнутраных спраў накіравана каля дзесяці такіх скаргаў, праводзіцца адпаведная праверка.

**Варвара МАРОЗАВА.**

Надвор'е

# Другі дзень ліпеня — і зноў спякота

## Пасля недаўгачаснага пахаладання прыпячэ да плюс 32 градусаў

**Як правіла, першы месяц лета ў нас на цяпло не заўсёды шчодры. Тым больш май выдаўся халодны. А сёлета чэрвень больш быў падобны на гарачы жнівень. А ліпень з першых дзён бярэ стырно ў свае рукі — будзе сонечна і спякотна, паведамляе спецыяліст Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

Заўтра да нас прыйдзе марское паветра, таму тэмпература ўначы будзе істотна халаднейшая за дзённую. А ўдзень надвор'е ў краіне будзе вызначаць поле паніжанага атмасфернага ціску, калі адаб'ецца ўплыў няўстойлівай паветранай масы, якая паступае з поўдня Балтыйскага мора. Чакаецца пераменная воблачнасць. Уначы будзе пераважна без ападкаў, раніцай і ўдзень месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя дажджы, магчымы навальніцы. Вецер прагназуецца заходні, паўднёва-заходні ўмераны, удзень парывісты, у асобных раёнах па паўночным захадзе моцны парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 10 да плюс 15 градусаў. А гэта значыць, што ў камфортных умовах выспімся за тыдзень. Удзень будзе 19—25 цяпла, па поўдні — да плюс 27 градусаў.

Але свежасць уначы будзе нядоўгая. У чацвер уначы ў крайніх паўночна-заходніх, а ўдзень і ў цэнтральных раёнах краіны адаб'ецца ўплыў франтальнай сістэмы, услед за якой пачне пастулаць цёплая паветраная маса з поўдня Еўропы. У сувязі з гэтым у згаданых рэгіёнах пройдуць кароткачасовыя дажджы, месцамі прагрымяць навальніцы. З'явіцца больш аблокаў. Вецер прагназуецца паўднёвы, паўднёва-заходні ўмераны, удзень пры навальніцах парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 12 да плюс 17 градусаў. Удзень будзе ад 23 да 29 градусаў цяпла, па поўдні тэмпература павысіцца да плюс 32 градусаў.

У трэці дзень ліпеня Беларусь апынецца пад уплывам атмасфернага фронту, які павольна змяшчаецца на паўднёвы ўсход. Уначы і раніцай на большай частцы тэрыторыі, а ўдзень у асноўным па паўднёвым усходзе краіны пройдуць кароткачасовыя дажджы. Месцамі прагрымяць моцныя дажджы і навальніцы. Вецер прагназуецца паўднёвы з пераходам на паўночны ўмераны, пры навальніцах парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 12 па паўночным захадзе да 20 градусаў па паўднёвым усходзе. Удзень будзе 20—27 цяпла, у паўднёва-ўсходніх раёнах да плюс 30 градусаў.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у суботу і нядзелю атмасферны ціск вырасце і ўсталюецца камфортнае надвор'е. Ападкаў чакаецца мала, толькі ўдзень у нядзелю ў асобных раёнах магчымыя кароткія летнія дажджы. Вецер прагназуецца пераменных напрамкаў, уначы слабы, удзень умераны. Тэмпература ўначы складзе ад плюс 10 да плюс 16 градусаў, удзень — 24—28 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Аты-баты

# Маладыя лейтэнанты адпраўляюцца ў войска

**У Ваеннай акадэміі адбылася ўрачыстая цырымонія выпуску маладых лейтэнантаў. Больш за 400 чалавек паспяхова скончылі вучобу на сямі факультэтах. Ужо праз месяц яны пачнуць несці службу.**

Падчас цырымоніі **міністр абароны Віктар ХРЭНІН** адзначыў, што ў злучэннях і воінскіх часцях, куды накіроўваюцца выпускнікі для далейшага праходжання службы, яны мусяць вырашаць шмат адказных задач. Сярод іх — забеспячэнне высокай баявой гатоўнасці, выхаванне і навучанне падначаленых, засваенне новага ўзбраення. І вучыцца ім давядзецца ўвесь час — нягледзячы на тое, што яны атрымалі цалкам сучасную адукацыю.

— Ваенная справа не стаіць на месцы. Развіваецца зброя, баявая тэхніка, удасканальваецца ваеннае мастацтва. Усё гэта патрабуе пастаяннай работы над сабой, павышэння прафесійнага ўзроўню. Будзьце патрабавальнымі і клапатлівымі камандзірамі, няўхільна падтрымлівайце вайсковую дысцыпліну і арганізаванасць, — звярнуўся да выпускнікоў кіраўнік ваеннага ведамства. — Шмат хто з вас прыняў удзел у парадзе да Дня Перамогі. Мы паказалі непарыўную сувязь пакаленняў няскоранага беларускага народа, вернасць подзвігу пераможцаў. Незалежнасць краіны — гэта перш за ўсё велізарная адказнасць за забеспячэнне яе бяспекі, абароны нацыянальных інтарэсаў, міру на нашай зямлі. Гэтую высокую адказнасць афіцэры прынялі на сябе.

**Начальнік Ваеннай акадэміі Віктар ЛІСОЎСКІ** зазначыў, што сярод выпускнікоў сёлета 12 узнагароджаны залатым медалём і дыпломам з адзнакай.

Адзін з іх — Уладзіслаў Ёрш. Ён будзе служыць у 8-й радыётэхнічнай брыгадзе ў Баранавічах.

— Я адчуваю адначасова радасць і смутак, — дзеліцца лейтэнант. — Радасць — таму што я пераадолеў гэтыя чатыры гады. Калісьці паставіў сабе мэту атрымаць залаты медаль, афіцэрскія пагоны — і яна дасягнута. А смутак — з-за таго, што развітваюся з камандзірамі, якія чатыры гады замянялі родных і блізкіх, з выкладчыкамі, з якімі рабіліся адкрыцці. Акадэмія была маім другім домам, я таксама з ёй развітваюся і разумею, што калі і вярнуся сюды, то не хутка.

І вось гучыць марш «Развітанне славянкі». Выпускнікі ідуць па плацы ўрачыстым маршам і хаваюцца з вачэй за паваротам. Наперадзе ў іх — новае, афіцэрскае жыццё.

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### На прэзідэнцкіх выбарах у Польшчы адбудзецца другі тур




Ніводны з кандыдатаў не атрымаў неабходную для перамогі простую большасць галасоў. Дзеючы кіраўнік дзяржавы Анджэй Дуда, кандыдат ад кіруючай кансерватыўнай партыі «Права і Справядлівасць» заручыўся падтрымкай больш чым 45 працэнтаў выбаршчыкаў. У другім туры 12 ліпеня яго апанентам стане кандыдат ад найбуйнейшай апазіцыйнай партыі «Грамадзянская платформа», мэр Варшавы Рафал Тшаскоўскі, які набраў каля 29 працэнтаў галасоў. Назіральнікі адзначаюць, што ў фінальным раўндзе шанцы на перамогу ёсць у абодвух кандыдатаў, паколькі апазіцыйныя галасы аб'ядноўца супраць дзеючага прэзідэнта. Кіруючая партыя летась на парламенцкіх выбарах атрымала абсалютную большасць. У выпадку перамогі Тшаскоўскага ў прэзідэнцкай гонцы апазіцыя здабудзе палітычную перавагу — кіраўнік дзяржавы ў Польшчы валодае правам вета і прызначэнняў на ключавыя пасады.

### СААЗ зафіксавала новы рэкорд па колькасці заражэнняў каранавірусам

Сусветная арганізацыя аховы здароўя 28 чэрвеня зафіксавала новы рэкорд па колькасці заражэнняў каранавірусам за суткі — больш за 189 тысяч чалавек. Пра гэта паведаміла ТАСС. Як вядома, СААЗ арыентуецца толькі на афіцыйныя даныя дзяржаў. Адзначаецца, што эпідэмія дасягнула рэкордна высокага ўзроўню ў ЗША — там паказчыкі перавышаюць 40 тысяч выпадкаў заражэння за суткі. Прыкладна на такім жа ўзроўні паказчыкі ў Бразіліі. Ачагом распаўсюджвання інфекцыі ў Азіі застаецца Індыя. Раней прыводзіліся даныя ўніверсітэта Джонса Хопкінса на раніцу 29 чэрвеня. Паводле інфармацыі даследчага праекта, у свеце заражаныя ўжо звыш 10,1 мільёна чалавек. За ўвесь перыяд пандэміі памерла звыш 500 тысяч інфіцыраваных, 5,1 мільёна чалавек паправіліся.



### Амерыканскі штат Місісіпі пазбавіўся сцяга



Палата прадстаўнікоў і Сенат Місісіпі прагаласавалі за адмову ад цяперашняга сцяга гэтага штата, які калісьці ўваходзіў у Канфедэрацыю Поўдня ЗША. З таго моманту на сцягу прысутнічала сімволіка арміі канфедэратаў: чырвоны квадрат з сінім Андрэеўскім крыжом, у які ўпісана 13 белых зорак. Чарнаскурыя складаюць 38 працэнтаў насельніцтва штата, і гэтыя сцяг, як мяркуюць заканадаўцы, змяшчае эмблему, якая іх выбаршчыкамі лічыцца расісцкай. Камісіі даручылі распрацаваць дызайн новага сцяга, ён ужо не будзе ўтрымліваць сімволікі канфедэратаў, але словы пра веру ў бога застануцца. Жыхарам Місісіпі прапануюць ухваліць новы варыянт сцяга штата 3 лістапада, у дзень выбараў прэзідэнта ЗША.

Выстаўка

# «ВЫБУХОВАЯ» ДЖАКОНДА І «КАЛАЖНЫ» ЧАРЛІ ЧАПЛІН

## Маладыя мастакі Беларусі прадстаўляюць сваё бачанне свету на «Арт-панараме» ў Гродне

**Праект, які ладзіцца Гродзенскім дзяржаўным гісторыка-археалагічным музеем пры ўдзеле абласнога аддзялення Беларускага саюза мастакоў, сёлета аб'яднаў 30 маладых аўтараў. Усе яны маюць мастацкую адукацыю, многія не першы раз удзельнічаюць у выстаўцы, якая, дарэчы, складаецца па выніках конкурснага адбору. Экспазіцыя заняла сваё традыцыйнае месца ў Сенатарскай зале Новага замка і здзіўляе не толькі рознымі жанрамі, але і асаблівасцямі светапогляду маладых мастакоў.**

Знаёмімся з Аляксандрай Галенкай, якая чарговы раз прыехала ў Гродна, каб паўдзельнічаць у праекце «Арт-панарама». Сёлета яна прадставіла трыпціх з серыі «CINEMA», які створаны сумесна з Ганнай Канапелькай у тэхніцы калажу. Такі падыход бачыцца аўтарам як вельмі актуальны, бо дазваляе аб'яднаць сучасныя тэхналогіі і творчасць.

— Аснова — гэта папера, якая складаецца такім чынам, каб атрымаўся нейкі вобраз. На самай справе, клеіць можна ўсё, што заўгодна, нават аб'ёмныя рэчы. Калаж не толькі павінен быць плоскі. Гэтай тэхнікай можа займацца кожны, не толькі з мастацкай адукацыяй. Тут можа выканаць твор і з паперы, і з тканіны, — кажа мастачка.

Паколькі дзяўчаты цікавяцца тэмай кіно, яны ўвасобілі яе ў трох работах, кожная прывязана да нейкага стылю і перыяду кінематографа. Аўтары звярнуліся да творчасці Чарлі Чапліна як прадстаўніка чорна-белага кіно.

— Фільмы настолькі добрыя і станоўчыя. І смешна, і кранальна, — заўважае Аляксандра. — Таму мы вырашылі вярнуць тую эпоху і нагадаць аб ёй. Мы назвалі гэты калаж «Космас Чарлі Чапліна».

Яшчэ адзін трыпціх са зваротам у мінулае прапанаваў на суд гледачоў мінчанін Леанід Несцярук. Ён бярэ за аснову знакамітую Джаконду і карціны «з загадкай» Джэксана Полака і стварае трыпціх пад назвай «Джаконда нумар 5». Аўтар трансфармуе вобраз Джаконды ў новы твор. Тут і стылістыка Рэнесансу і кірункі XX стагоддзя, і сваё бачанне мастацтва.

Увогуле тут ёсць на чым спыніць вока. Работы цікавыя і па-філасофску змястоўныя. Напрыклад, твор Таццяны Катляровіч-Савік выкананы на дошцы з выцягнутым вобразам вандроўніка нагадвае іканапісны твор. «Пусты прамавугольнік сімвалізуе пустату, якую адчуваюць унутры сябе многія людзі. Мы самі выбіраем, чым яе і як яе запоўніць альбо пакінуць усё як ёсць», — тлумачыць у сваёй анатацыі аўтар карціны.

Маладыя мастакі прадстаўляюць і сваё бачанне моцы чалавека, яго здольнасці выбрацца з кола тых праблем, якія цягнуць яго ў дрыгву. Інсталяцыя Яўгена Рамашова пад назвай «2020» якраз на гэтую тэму. Асноўнае палатно — творча апрацаваны фотаздымак на тканіне. Тут аўтар увасобіў тыя праблемы, якія напаткалі чалавека сёлета, у першую чаргу пандэмія. Відавочна, як герою карціны складана прабіцца праз дрот, але ёсць надзея, што гэтыя выпрабаванні ён пераадолее, аб чым сведчыць фрагмент інсталяцыі — штыкетнік з накручаным на яго дротам унізе карціны.



— Маладыя мастакі могуць прадэманстраваць сваё бачанне свету, «болевыя» кропкі, — кажа **мастацтвазнавец, супрацоўнік музея Кацярына АРАБЕЙ.** — Работы прадстаўлены ў розных тэхніках. Гэта і сграфіта, і мазаічныя пано з каменя і медзі, і фотаработы, і камп'ютарная графіка. Гродзенскі мастак Эміль Зянько зрабіў відэапраект — роздум пра ўздзеянне на чалавечы арганізм наркотыкаў.

Кожны год з'яўляюцца новыя аўтары. Згодна з палажэннем конкурснага адбору, гэта маладыя мастакі да 35 гадоў, работы якіх створаны не больш, чым за пяцігадовы перыяд. Самі ўдзельнікі станоўча ставяцца да магчымасці выстаўляцца ў каралеўскім замку.

Які далейшы лёс работ? Вядома, яны вернуцца іх аўтарам.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**
**Фота аўтара.**

Свята ў хату!

# Віцебску споўнілася 1046 гадоў

**Лічыцца, што горад быў заснаваны ў 974 годзе. Дарэчы, па «ўзросце» ён — другі ў краіне, пасля «калыскі гарадоў беларускіх» — Полацка... Пандэмія ўнесла карэктывы ў маштаб святкавання: большасць мерапрыемстваў можна было ўбачыць у «віртуальным фармаце».**

Традыцыйна святкаванне распачынаецца 26-га чэрвеня — у дзень вызвалення ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Кіраўніцтва гарвыканкама, аблвыканкама, дэпутаты, лідары грамадскіх арганізацый усклалі кветкі да манумента вызваліцелям, які знаходзіцца на плошчы Перамогі. Сярод удзельнікаў ганаровай цырымоніі былі і старажылы горада, чый лёс «апалены» вайной... У 1944 годзе савецкіх воінаў сустракалі ўсяго каля 120 гараджан. А да пачатку Вялікай Айчыннай вайны ў Віцебску пражывалі 167,3 тысячы чалавек. На сённяшні дзень у горадзе 364,8 тысячы жыхароў.

Узнагароджанне лаўрэатаў звання «Віцябчанін года» — добрая традыцыя падчас святкавання. Вось і сёлета ўшанавалі тых, хто зрабіў горад больш прыгожым, камфортным для пражывання, утульным або ўнёс свой уклад у тое, каб пра Віцебск лепш ведалі за мяжой. Сярод самых дастойных каля дзесяці гараджан: урач хуткай медыцынскай дапамогі Сяргей Мікодзін, генеральны дырэктар ААТ «Даламіт» Іван Бабак, кіраўнік прыватнага вытворча-гандлёвага ўнітарнага прадпрыемства «Машынабудаўнічая кампанія «Віцебскія пад'ёмнікі» Андрэй Сідараў і іншыя.

**Старшыня гарвыканкама Вадзім ЗАРАНКІН** падкрэсліў, што ў Віцебску шмат таленавітых, працавітых, добрасумленных жыхароў, таму выбраць найбольш годных вельмі цяжка.

Што датычыцца мерапрыемстваў, арганізатары трохдзённага святкавання прыдумалі новы спосаб «быць разам, але асобна». Была магчымасць, не выходзячы з дому, убачыць цікавыя выстаўкі, праекты, імпрэзы.

У прыватнасці, у выставачнай зале цэнтра сучаснага мастацтва адбылося адкрыццё анлайн-выстаўкі твораў мясцовых мастакоў «Партрэт горада».

Гарадскі цэнтр дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі прэзентаваў у віртуальным павуцінні творчы месендж «Віцебск — горад дзяцінства». У праграме былі віншаванні ад гуртκоўцаў, канцэртныя нумары, літаратурна-музычныя кампазіцыі.

Бібліятэка імя Горкага ў адной з сацыяльных сетак арганізавала паэтычны марафон...

Але былі падзеі і ў рэале. Каля канцэртнай залы «Віцебск» было чаму прыемна здзівіцца. Тут стартаваў ужо ўпадабаны гараджанам адкрыты гарадскі творчы праект «Віцебскі квАРТал», у рамках якога аматары гісторыі роднага горада змаглі прыняць удзел у аўта-, вела-, пешаходным квэсце «Карта музеяў Віцебска». Самыя хуткія і самыя крэатыўныя гульцы атрымалі памятныя прызы. Вельмі цікавае там жа было мерапрыемства «Зроблена з сэнсам» з удзелам аматараў аўтагуку, а таксама выступленне школы карнавальнай самбы і бразільскіх барабанаў RACCOON BATUCADA...



**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
**Фота аўтара.**

Праекты і рашэнні

# «ПРАКАЧАЦЬ» БІЗНЕС-ЖЫЛКУ

**На Гомельшчыне маладыя людзі, якія мараць адкрыць уласную справу ці проста шукаюць работу, могуць разлічваць на дапамогу словам і не толькі. У рэгіёне пачалі працаваць настаўнікі, якія дапамогуць арганізаваць самазанятасць і абудзіць прадпрымальніцкую актыўнасць.**

Інстытут настаўніцтва па працаўладкаванні моладзі на Гомельшчыне — частка доўгатэрміновага праекта «EU4Youth: развіццё патэнцыялу для працаўладкавання». Ініцыятыву рэалізуе Беларускае таварыства Чырвонага Крыжа пры фінансавай падтрымцы Еўрапейскага саюза ў партнёрстве з органамі ўлады і недзяржаўнымі аб'яднаннямі.

Праект накіраваны на развіццё прафесійна-тэхнічных навыкаў для працаўладкавання пераважна сярод сацыяльна неабароненых маладых мужчын і жанчын.

Перад пачаткам работы з моладдзю падрыхтоўку прайшло больш як 20 «настаўнікаў». Гэта супрацоўнікі Гомельскай абласной арганізацыі Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа, спецыялісты раённых упраўленняў па працы, занятасці і сацыяльнай абароне насельніцтва, а таксама валанцёры.

— Перад тым як уключыцца ў працэс, настаўнікі для мэтанакіраванай моладзі прайшлі трэнінг «Інструменты для настаўніцтва і бізнесу», — тлумачыць **начальнік арганізацыйна-кадравага аддзела Гомельскай абласной арганізацыі Беларускага таварыства Чырвонага Крыжа Арцём КАРПЕНКА:**

— Так, напрыклад, удзельнікі пазнаёміліся з аспектамі падбору пар «настаўнік — вучань», адпрацавалі алгарытм узаемадзеяння з беніфіцыярам. Асобны блок падрыхтоўкі гэтых людзей быў прысвечаны спосабам і механізмам усталявання камфортнай псіхалагічнай атмасферы паміж удзельнікамі праекта. Да таго ж значную ўвагу пры падрыхтоўцы спецыялістаў аддалі выпрацоўцы навыкаў безканфліктавых зносін, асновам матывацыі, закранулі і іншыя аспекты, — растлумачыў суразмоўнік.

На трэнінгі па фарміраванні бізнес-навыкаў цяпер могуць разлічваць і ініцыятыўныя маладыя людзі Гомельскай вобласці.

— У цэлым жа сёлета разнапланавую дапамогу па працаўладкаванні ад праекта атрымаюць больш як 20 жыхароў вобласці ва ўзросце ад 18 гадоў да 31 года. Яны павысяць свае шанцы на паспяховае працаўладкаванне або падрыхтуюцца да адкрыцця сваёй справы, — дадалі ў Гомельскай абласной арганізацыі БТЧК.

Згодна з праектам, у рэгіёне пры ўпраўленнях па працы, занятасці і сацыяльнай абароне насельніцтва ў раёнах адкрыты шэсць інфармацыйных цэнтраў. На іх базе ўдзельнікі праекта могуць не толькі атрымаць інфармацыйную дапамогу, але і прайсці курсы працоўнай перападрыхтоўкі. Некаторыя маладыя людзі ўжо скарысталіся такой магчымасцю:

— Адзін з удзельнікаў атрымаў дадатковую катэгорыю аўтамабільных правоў, якая дазволіла яму працаўладкавацца ў сферы грузаперавозак. Другая ўдзельніца прайшла навучанне па кройцы і шыццю, стала прадпрымальніцай, — прывялі прыклады ў абласной структуры таварыства.

Інфармацыйныя цэнтры дзейнічаюць у Гомелі, Рагачове, Карме, Мазыры і Рэчыцы. Між тым у кожным райцэнтры моладзь можа звярнуцца па дапамогу да «настаўнікаў»-спецыялістаў раённых падраздзяленняў Гомельскай абласной арганізацыі БТЧК і валанцёраў. Маладому чалавеку трэба толькі пакінуць заяўку, а потым разам скласці пэўны план працоўнай актыўнасці.

— Цяпер мы назіраем значную актыўнасць удзельнікаў, бо скончана навучанне ў ВНУ, сярэдніх спецыяльных і прафесійна-тэхнічных навучальных установах. Моладзь шукае шляхі працаўладкавання, — дадалі куратары праекта. — Ужо можна адзначыць значны плюс такой працоўнай ініцыятывы. Гэта магчымасць для моладзі з раёнаў знайсці работу, падрыхтавацца да самазанятасці непасрэдна ў сваёй мясцовасці, побач з роднымі. Для многіх гэта важна.

У цэлым за час рэалізацыі праекта «EU4Youth: развіццё патэнцыялу для працаўладкавання» з пачатку мінулага года ў рэгіёне дадатковыя веды і ўменні па пошуку работы, арганізацыі сваёй справы і іншую дапамогу ўжо атрымалі больш як 100 жыхароў вобласці.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

# ЯК ПРАВЕСЦІ ГЭТА ЛЕТА?



*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



**Дырэктар Дэпартамента па турызме Міністэрства спорту і турызму Ірына ВАРАНОВІЧ** адзначае, ведамства працягвае работу з арганізацыямі і аб'яднаннямі практычна штодня, бо далёка не ўсе пытанні яшчэ вырашаны. Адной з галоўных праблем турыстычнай індустрыі ў гэтыя тры месяцы стала пытанне аб вяртанні грашовых сродкаў турыстам, якія афармілі раней браніраванне тураў. Нагадаем, пры раннім браніраванні пуцёўкі купілі каля 300 тысяч беларусаў, а агульная сума запазычанасці перад імі была прыкладна 400 мільёнаў рублёў. Сёння, дзякуючы разуменню кліентаў, можна сказаць, што пытанне вырашана з 85 % турыстаў, з імі дасягнута дамоўленасць, гэта значыць, кліентам альбо вярнулі грошы, альбо іх туры перанесены на больш познія тэрміны, у тым ліку на 2021 год. *«Сітуацыя з каранавірусам яшчэ не зусім зразумелая і незразумела, як яна будзе развівацца,* — кажа Ірына Мікалаеўна. — *Еўрапейскія краіны ўжо адкрыліся ўнутры, але кожны дзень з'яўляюцца новыя паведамленні, колькасць хворых то памяншаецца, то павялічваецца».*



*— Нашы турысты, перш за ўсё, у чаканні марскога паху, марской хвалі і сонца,* — кажа **старшыня савета Рэспубліканскага саюза турыстычных арганізацый Аксана БІЧУН.** — *На сённяшні дзень турыстычныя аператары са сваімі партнёрамі прыкладні максімум намаганняў, каб пастарацца ў гэтых няпростых умовах стварыць усе перадумовы для бяспечнага адпачынку. Наша турыстычная галіна жывая, яна спраўляецца з выклікамі сённяшняга дня і верыць у найлепшае,* — падкрэсліла Аксана Анатолеўна.



Сапраўды, пазітыўных фактараў, якія кажуць пра тое, што турызм ажывае шмат, але пакуль гэтыя тэндэнцыі вельмі далікатныя, таму што многія краіны адсоўваюць тэрміны пачатку палётнай праграмы і адкрыцця межаў. *«Таму мы не можам гарантаваць са стапрацэнтнай упэўненасцю, што палётная праграма адновіцца, пакуль не атрымаем афіцыйныя дакументы ад замежных партнёраў»,* — тлумачыць **старшыня Рэспубліканскай асацыяцыі турыстычных агенцтваў Алена КУДЛАКОВА.**

## У НАШЫМ ТОПЕ — ЛОДКІ, БАЙДАРКІ, СПА-КОМПЛЕКСЫ

Нягледзячы на тое, што адкрываюцца палёты ў іншыя краіны, хтосьці ўсё ж вырашыць застацца адпачываць у Беларусі. Ірына Варановіч адзначае, што гэтае пытанне таксама прапрацоўваецца з турыстычнымі аб'яднаннямі краіны. *«На мінулым тыдні адбылося пасяджэнне рабочай групы з нагоды распрацоўкі рэкамендацый, як неабходна дзейнічаць падчас тураў па Беларусі. Гэтыя рэкамендацыі будуць знаходзіцца ў вольным доступе. Спачатку месяца ўжо пачаліся арганізаваныя турыстычныя паездкі па краіне з захаваннем усіх мер бяспекі ў аўтобусе. Напрыклад, рассаджванне ў ім павінна ажыццяўляцца ў шахматным парадку, таксама абавязковая наяўнасць у аўтобусе дэзынфіцыруючых сродкаў»,* — адзначае Ірына Варановіч.

Нягледзячы на адкрытыя межы, уязны турызм у Беларусі пакуль цалкам адсутнічае, але *«мы рады, што пашыраецца спіс краін, пасля якіх не трэба знаходзіцца на каранціне, напрыклад, да нас ужо могуць прыехаць амерыканскія і турэцкія турысты»,* — адзначае **старшыня праўлення Рэспубліканскага саюза турыстычнай індустрыі Філіп ГУЛЫ.**



*«Спадзяемся, што рана ці позна да іх далучацца і расіяне ці хоць бы турысты з некаторых расійскіх рэгіёнаў, дзе сітуацыя з каранавірусам стабілізуецца».* Філіп Анатолевіч падкрэслівае, што ўнутраны турызм у Беларусі — гэта, перш за ўсё, інфраструктура, таму самыя складаныя праблемы пакуль адчуваюць гасцініцы. *«У некаторых рэгіёнах мясцовая ўлада дастаткова эфектыўна змагла распарадзіцца ўказамі № 143 «Аб падтрымцы эканомікі» і № 178 «Аб часовых мерах дзяржаўнай падтрымкі найманьнікаў і асобных катэгорый грамадзян», але гэтая падтрымка закранула не ўсіх. Што датычыцца актыўнага турызму — лодкі, байдаркі, экалагічныя сцежкі, санаторыі, спа-комплексы, тут наплыў і попыт у беларусаў досыць высокі. Жыхары гарадоў і абласных цэнтраў падарожнічаюць актыўна, таму з чацвярга да панядзелка загрузка вельмі высокая. Санаторыі загружаныя пакуль на 28 %, але, напрыклад, да майскіх свят гэты працэнт не дасягаў і 15, таму досыць нядрэнна,* — адзначае Філіп Гулы, дадаючы, — *Але сэрвіс не ўсюды адпавядае запытам беларускіх грамадзян, і гэта якраз тая добрая нагода палепшыць яго. Пытанні з сэрвісам пачынаюцца з сістэмы ўзаемадзеяння з кліентам або пасярэднікам, які браніруе пуцёўку або прадае яе, а заканчваюцца непасрэдна сэрвісам на месцы. Спадзяюся, што гэтая сітуацыя дасць нам добрае эфектыўнае развіццё».*

На завяршэнне адзначым, што цяпер у турыстычнай галіне краіны ідзе абмеркаванне новага праекта закона аб турызме. На працягу двух тыдняў спецыялісты сустракаліся штодня для яго абмеркавання. Яны адзначаюць, што з улікам сітуацыі з каранавірусам стары закон агаліў шматлікія праблемы галіны, у тым ліку падзел адказнасці паміж турыстычнымі агенцтвамі і аператарамі і забеспячэнне бяспекі турыста ва ўмовах абставін непераадольнай сілы.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ.**
**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**

Будзьце ў курсе

# НЯХАЙ МОРА ХВАЛЮЕЦЦА ЗАМЕСТ НАС

**Лета! Адпачынак! Мора? Ці ёсць шанц у беларусаў гэтым летам акунуцца ў цёплыя марскія хвалі? Спойлер: шанц на адпачынак каля мора ў нашых суайчыннікаў ёсць, але выбар турыстычных напрамкаў пакуль больш чым абмежаваны.**

## КУДЫ ЎЖО МОЖНА

Лета 2020 для беларусаў нарэшце пачалося: у Албанію з Мінска паляцеў першы чартар.

— Народ адразу ажывіўся: зразумеў, што мы ўсё ж такі зможам адпачыць сёлета, — расказвае **дырэктар ТАА «Мір тураў бел» Вольга ЯКУБОЎСКАЯ.** — Вельмі хутка ўсё было распрададзена на чэрвень, цяпер актыўна прадаюцца туры на ліпень.

Віза ў Албанію не патрэбна — гэта краіна ўвяла для беларусаў бязвізавы рэжым на летні перыяд. Як адзначаюць тураператары, сёлета турысты далёка не загадваюць: купляюць тур і вылятаюць ужо праз тыдзень, а часам і праз два-тры дні.

— Але гэта магчыма, калі ёсць месцы, — кажа Вольга.

Месцаў можа і не быць: краіна, куды ёсць магчымасць вылецець, каб парадавацца пляжным адпачынкам, пакуль усяго адна, а паток турыстаў вялікі. Беларускае лета не заўсёды радуе надвор'ем, ды і стаміліся людзі ад сітуацыі апошніх месяцаў. Так што, нягледзячы на COVID, турыстаў, якія жадаюць «махнуць да мора», хапае.

Калі першыя турысты паляцелі ў Албанію і сталі выкладваць фота, усім стала спакайней, кажа суразмоўніца. Быццам бы «першапраходцы» задаволеныя. Два моры — Іанічнае і Адрыятычнае, прыгожыя пляжы, даволі танныя морапрадукты, ветлівыя работнікі гасцявога сэрвісу.

— У Албаніі нашых турыстаў сёлета сустракалі ўрачыста — з кветкамі і шарыкамі. Для прымаючага боку гэта ж таксама вельмі важна. Першыя турысты — гэта значыць, што ты пачынаеш працаваць, з'яўляецца надзея, што сезон адбудзецца.

## КУДЫ НАС, МАГЧЫМА, ПУСЦЯЦЬ

Такім чынам, на сённяшні дзень варыянт пляжнага адпачынку ў нашых суайчыннікаў толькі адзін — Албанія.

— Мы разлічвалі на Чарнагорыю, і неафіцыйна яны нам пацвердзілі, што 16 чэрвеня быццам бы пачнуць прымаць турыстаў. Мы чакалі афіцыйнага пацвярджэння. Але пакуль яны не гатовыя адкрыць свае граніцы для гасцей з Беларусі, — кажа Вольга.

Традыцыйныя адпускныя еўрапейскія напрамкі пакуль для нас таксама закрытыя. Польшча і Літва пускаюць беларусаў толькі па рабочых візах. Турыстычны шэнген нам пакуль ніхто не выдае.

Першым са звыклых адпускных еўрапейскіх напрамкаў, куды, як мяркуюць тураператары, паляцяць гэтым летам беларускія турысты, стане Грэцыя.

— Візавыя цэнтры Грэцыя адкрывае з 29 чэрвеня. Пакуль незразумела, калі яны пачнуць выдаваць турыстычныя візы, але мы спадзяёмся, што з гэтай даты. Так што арыенціровачна з 15 ліпеня Грэцыя стане даступная. Але поўнай упэўненасці ў гэтым няма.

З 1 ліпеня быццам бы адкрываюць межы для беларускіх турыстаў Турцыя, Егіпет і Туніс, з сярэдзіны ліпеня — Балгарыя. Калі ўсё будзе так, як чакаецца, выбар у айчынных адпускнікоў з'явіцца. Дарэчы, Егіпет да 31 кастрычніка зрабіў візы для беларусаў, якія набываюць тур, бясплатнымі.

Збіраецца ў ліпені прымаць турыстаў і Грузія, але больш-менш дакладнай інфармацыі па гэтай краіне пакуль у тураператараў няма.

— Магчыма, Грузія будзе прымаць турыстаў з тэстамі на COVID-19, зробленымі за 72 гадзіны да вылету. А можа быць, з каранцінам (14 дзён). У апошнім выпадку гэта, зразумела, не турыстычны варыянт.

***— Якія яшчэ краіны будуць патрабаваць тэсты?***

— Пакуль нічога пра гэта сказаць не магу. Магчыма, Туніс. Сёння тураператары спрабуюць дамовіцца аб тым, каб беларускіх гасцей прымалі без тэстаў. Уявіце, цэлы самалёт турыстаў павінен прыйсці за 72 гадзіны да вылету і здаць тэст. Не ведаю, наколькі гэта магчыма. У любым выпадку, выкліча ў людзей негатыў. Турцыя плануе прымаць беларусаў без тэстаў, як і Егіпет. Але інфармацыя мяняецца кожны дзень.

## ДЗЕ НАС ПАКУЛЬ НЕ ЧАКАЮЦЬ

Італія мела намер адкрыць граніцу для беларускіх турыстаў з 15 чэрвеня. Але да гэтага часу італьянскія межы закрытыя. Тое ж самае датычыцца і Іспаніі. Зараз іспанскія курорты пачалі прымаць турыстаў з краін Еўрасаюза. Ці пусцяць іспанцы ў госці нас, будзе залежаць ад таго, як складзецца ў гэтай краіне эпідэмічная сітуацыя. Калі прыток еўрапейскіх турыстаў не паўплывае на рост захварэльнасці на каранавірус у Іспаніі, тады нешта, магчыма, будзе «свяціць» і нам.

Кіпр пакуль таксама пад пытаннем. Але беларускія тураператары спадзяюцца, што пасля таго, як Грэцыя адкрые свае курорты для нашых турыстаў, іх пачне прымаць і Кіпр.

Больш далёкія і экзатычныя напрамкі сёння тураператары нават не разглядаюць. Краіны Паўднёва-Усходняй Азіі і Эміраты пакуль закрытыя. Акрамя таго, ляцець на адпачынак праз Расію ці Украіну сёння немагчыма — у абедзвюх краінах прадугледжаны два тыдні каранціну. Магчыма, у найбліжэйшы час гэтыя краіны ўвядуць для беларусаў магчымасць транзіту.

Аб новых турыстычных напрамках таксама гаворкі не ідзе — вярнуць бы тое, што было.

## З ПУНКТУ ГЛЕДЖАННЯ БЯСПЕКІ

Так ці інакш, да канца лета выбар у нас сапраўды з'явіцца. Куды варта ехаць, а якія напрамкі ўсё ж лепш не выбіраць?

Быццам бы бяспечная Грэцыя — там не было сур'ёзнага ўсплёску «кароны». У Італіі пацярпела поўнач, поўдзень пандэмія закранула менш, а на астравах у эпідэмічных адносінах бяспечней за ўсё. У Іспаніі пандэмію лепш за ўсё перанесла Маёрка, кажа Вольга Якубоўская. Калі ў канцы лета Італія і Іспанія адкрыюць для нас свае курорты, гэта трэба ўлічваць.

Турцыя і Егіпет — традыцыйна найбольш бюджэтныя і вельмі масавы адпачынак. У матах бяспекі там уведзена сертыфікацыя для атэляў.

— Будуць змены, накіраваныя на тое, каб не дапусціць масавага збору людзей. Шведскі стол будзе хутчэй за ўсё цяпер з афіцыянтамі, на пляжах тапчаны паставяць далей адзін ад аднаго, — тлумачыць суразмоўніца.

***— Як арганізаваць свой адпачынак, каб засцерагчы сябе з эпідэмічнага пункту гледжання?***

— Калі вы «самаізалюецеся», самае бяспечнае — домік каля мора. Гэта можа быць бунгала, віла, асобныя гасцявыя домікі. Як правіла, такі тып атэляў даражэйшы. Ды і моладзь, напрыклад, засумуе сядзець у аддаленні ад людзей «для бяспекі». Можна выбраць тур без харчавання або толькі са снеданнем, арандаваць аўто і аб'ездзіць усе найбліжэйшыя цікавыя мясціны. Гэта, з аднаго боку, досыць бяспечны варыянт з пункту гледжання пандэміі, з другога — дазваляе лепш пазнаёміцца з краінай і ўбачыць значна больш, чым традыцыйныя пляжны адпачынак. Зрэшты, у вялікіх атэлях знаходзіцца настолькі ж небяспечна з пункту гледжання магчымасці заразіцца каранавірусам, як у мінскім метро або ў краме каля дома. Ну, а мыць рукі з мылам і надзяваць маску ў месцах збору людзей — напрыклад, у самалёце — гэта, вядома, правільна. І самае галоўнае — не забывацца пра страхоўку. І звяртаць увагу на тое, ці пакрывае ваша страхоўка выпадкі заражэння COVID-19. Лепш асобна ўдакладніць гэты момант у сваёй страхавой кампаніі.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ

## ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОНА: ГОЛОЦКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ,

**Минский область, Пуховичский район, аг. Голоцк, ул. Центральная, 11, тел.: 8 (01713) 94689, 68636, 66899.**

**Дата проведения ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА: 16 июля 2020 года в 15.00**

| № лота | Адрес земельного участка | Кадастровый номер; целевое назначение земельного участка; вид права | Площадь земельного частка, га | Инженерная инфраструктура (возможность подключения) | Начальная цена, руб. | Задаток, руб. | Расходы по подготовке, руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | (ПОВТОРНО) Минская область, Пуховичский р-н, д. Лысовщина, ул. Светлая | 624482502601000128 строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома; частная собственность | 0,1041 | Сети электроснабжения газоснабжения | 7844,98 | 784,50 | 1674,49 + стоимость объявления в СМИ |
| 2 | (ПОВТОРНО) Минская область, Пуховичский р-н, д. Лысовщина, ул. Шоссейная | 624482502601000119 строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома; частная собственность | 0,1125 | Сети газоснабжения | 7630,20 | 763,00 | 1603,45 + стоимость объявления в СМИ |
| 3 | (ПОВТОРНО) Минская область, Пуховичский р-н, д. Лешница | 624482502401000275 строительство и обслуживание одноквартирного жилого дома; частная собственность | 0,1231 | Сети электроснабжения | 6881,29 | 688,10 | 1723,79 + стоимость объявления в СМИ |

**Задаток для участия в открытом аукционе перечисляется** на расчетный счет № BY11AKBB36006250500040000000 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Минск, код банка AKBBBY2X, МФО 153001795, УНП 600177877, ОКПО 04431027, код платежа – 04901, Голоцкий сельский исполнительный комитет.

**Срок внесения задатка** – до подачи заявления на участие в открытом аукционе. **Назначение платежа:** внесение суммы задатка на участие в аукционе. **Окончание приема заявлений на участие в открытом аукционе** с прилагаемыми к ним документами – **10 июля 2020 года, до 17.00.**

Лицо, желающее принять участие в открытом аукционе. в отношении нескольких земельных участков (далее – предметов торгов), вносит задатки в размере, установленном для каждого из этих предметов торгов. Оплата стоимости предметов торгов осуществляется по безналичному расчету за белорусские рубли. Осмотр земельных участков на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время либо с участием представителя организатора в рабочее время (понедельник–пятница, 8.00–13.00, 14.00–17.00).

Открытый аукцион проводятся в порядке, установленном Положением о порядке организации и проведении аукционов по продаже земельных участков в частную собственность, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 № 462 .

В течение десяти рабочих дней после утверждения протокола победитель открытого аукциона обязан:

- возместить затраты на организацию и проведение открытого аукциона;
- возместить расходы, связанные с формированием земельного участка и изменением земельного участка в результате такого формирования, в том числе с государственной регистрацией в отношении этого земельного участка;
- выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона, которые подлежат выполнению до обращения за государственной регистрацией в отношении земельного участка;
- внести плату за земельный участок, продаваемый в частную собственность.

После совершения победителем открытого аукциона указанных действий, но не позднее двух рабочих дней, исполнительный комитет передает ему выписку из решения об изъятии земельного участка и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона и один экземпляр протокола.

Затраты на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к земельным участкам для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов подлежат возмещению в порядке, предусмотренном в соответствии с постановлением Совета Министров Республики Беларусь 1 апреля 2014 г. N 298 «Об утверждении положения о порядке возмещения лицом, которому предоставлен земельный участок, затрат на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к такому земельному участку»

---

*ООО «Центр Белинвентаризация»*
*г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1*

- ✓ **Раздел и установление порядка пользования земельным участком**
- ✓ **Раздел и вычленение изолированных помещений из капитального строения**
- ✓ **Пересчет долей в связи с изменением капитального строения**

## ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРА АРЕНДЫ ИМУЩЕСТВА КПУП «Гомельоблтеплосеть», тел. 8 (0232) 35 00 67

| № лота | Наименование объекта | Начальная стоимость лота, бел. руб. с НДС | Сумма задатка, бел. руб. |
|---|---|---|---|
| 1 | Часть помещений капитального строения площадью 61,9 кв. м, расположенных по адресу: г. Гомель, ул. Ирининская, 7Б. Цель использования: для размещения офиса, складских помещений, оказания услуг, осуществления розничной торговли, организации производства (кроме вредных производств). Срок договора аренды – 3 года, арендная плата в месяц 627,67 руб. с учетом НДС 20 % | **156,92 руб.** | **15,69 руб.** |

| | |
|---|---|
| **Срок подачи заявления** | **По 09 июля 2020 г.** в рабочие дни с 9.00 до 16.00 от даты опубликования настоящего извещения по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1 |
| **Дата, время и место проведения аукциона** | **13 июля 2020 г. в 11.00** по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 46, оф. 2-1 |
| **Номер р/с для перечисления задатка** | BY71BPSB30121783390109330000 в РД №300 ОАО «БПС-Сбербанк», БИК BPSBBY2X, УНП 491323266. Получатель платежа: ООО «Центр Белинвентаризация». Назначение платежа: задаток на участие в аукционе согласно извещению в газете «Звязда» от 30.06.2020 г. |
| **Условия продажи** | Шаг аукционных торгов – 10 %. Заключить договор аренды в течение 10 (десяти) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. Победитель возмещает затраты на организацию и проведение аукциона |

**Дополнительная информация на сайте www.bti-gomel.by, по тел.: (0232) 50 56 62, (029) 341 15 45**

---

## Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

## ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| |
|---|
| **ЛОТ 1: изолированное помещение с инвентарным номером 401/D-15049 (назначение – торговое помещение, наименование – универмаг), общей площадью 1828,3 кв. м, расположенное по адресу: г. Скидель, ул. Клубная, д. 1, кв. 2** |
| Лот № 1 расположен на земельном участке кадастровый № 422050400001000657, площадью 0,2162 га (назначение – земельный участок для эксплуатации и обслуживания здания универмага), расположенном по адресу: г. Скидель, ул. Клубная, д. 1 |
| Начальная цена продажи – 247 200 руб. (двести сорок семь тысяч двести рублей) с учетом НДС |
| Сумма задатка – 24 720 руб. (двадцать четыре тысячи семьсот двадцать рублей) |
| Условия проведения аукциона – аукцион без условий |
| **Продавец – Гродненское областное потребительское общество (Гродненский филиал), 230003, г. Гродно, ул. Озерское Шоссе, 41, тел. 39-29-90** |
| **Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 55-87-70** |
| Условия оплаты – по договоренности сторон. Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукциона |
| Номер р/с для перечисления задатка – BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка – BLBBBY2X, УНП 500833225 |
| **Аукцион состоится 17 июля 2020 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209** |
| Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion. Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 14.04.2020 г. |
| Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18 |
| **Последний день приема заявлений – 15 июля 2020 г. до 15.00** |

**Телефон для справок: 55-87-71 –**
**Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»**
**https://grino.by/aukcion**

---

**ОАО «ГОМЕЛЬОБЛРЕКЛАМА» ФИЛИАЛ «ЭКСПЕРТ-УСЛУГА»**
**(организатор аукциона)**
**отменяет аукционные торги по продаже права на заключение договора аренды недвижимого имущества лот № 1, назначенные на 08.07.2020 г.,**
*опубликованные в газете «Звязда» от 04.06.2020 г.*
**Продавец: учреждение «Гомельский областной клинический кожно-венерологический диспансер».**
Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора торгов: 8 (0232)23-23-54, 23-23-56, 8 (029)126-66-62. УНП 400071204

---

Центр Промышленной Оценки

- **Организация аукционов**
- **Оценка всех видов имущества**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

**Организатор аукциона**: ЗАО «Центр промышленной оценки». Юридический адрес: г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703

**Продавец:** ОАО «Борисовдрев». Минская область, г. Борисов, ул. 30 лет ВЛКСМ, 18

**Оператор ЭТП:** ООО «ИПМ-Консалт оценка». г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б

Адрес ЭТП: www.ipmtorgi.by

**Предмет электронных торгов: транспортное средство (спецтехника), бывшее в употреблении.**
**Местонахождение: Минская область, г. Борисов, ул. 30 лет ВЛКСМ, 18**

| № лота | Инв. № | Марка (модель), тип ТС, рег. знак, год выпуска | Начальная цена (с НДС 20 %) |
|---|---|---|---|
| 1 | 01550030 | ТГМ-4Б, тепловоз (отсутствует технический паспорт) | 88 295,69 бел. руб. |

**Порядок ознакомления:** осуществляется с понедельника по четверг: 08.00 до 17.00, пятница: с 08.00 до 15.45. Короткий Игорь Николаевич, контактные телефоны: +375 (29) 173 49 58, +375 (177) 73 96 88

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

| | |
|---|---|
| **Срок подписания договора купли-продажи** | **10 (десять) рабочих дней** после электронных торгов |

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи

**Электронные торги проводятся в порядке, установленном регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить затраты на организацию и проведение торгов, а также оплатить организатору торгов вознаграждение в размере 4 % процентов от цены продажи лота в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов, без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» 22.01.2020

**Дата и время начала и окончания электронных торгов**
**Начало торгов: 10.00 13.07.2020.**
**Окончание торгов: 12.00 13.07.2020.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки в случае если ставка поступила менее, чем за 10 минут до окончания торгов.

**Дата и время окончания приема заявок**: заявки на участие в электронных торгах принимаются по 09.07.2020 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by

| | |
|---|---|
| **Контактные данные** | **+375 17-280-36-37; +375 (29) 317-95-42; +375 (44) 704-92-06 E-mail: auction@cpo.by; info@ipmtorgi.by** |

---

БЕЛАРУСБАНК

**Публичная оферта (предложение)**
**на изменение порядка уменьшения ставки дохода по вкладу в связи с изменением ставки рефинансирования Национального банка Республики Беларусь до 7,75 % годовых**

1. ОАО «АСБ Беларусбанк» устанавливает, что снижение ставки дохода, указанной в договоре банковского вклада (депозита), в связи со снижением с 01.07.2020 ставки рефинансирования Национального банка Республики Беларусь до 7,75 % годовых (Постановление Правления Национального банка Республики Беларусь от 22.06.2020 № 204) осуществляется с 02.08.2020 по следующим банковским вкладам (депозитам) в белорусских рублях:

- срочный банковский вклад «Премиально-накопительный «Детский» (проценты по вкладам, открытым с 13.11.2015 по 31.03.2016 (включительно));
- срочный банковский вклад «Жилищно-накопительный» (проценты по вкладам, открытым по 28.10.2018 (включительно));
- банковский целевой вклад «Попечение» (проценты по вкладам, открытым по 31.01.2016 (включительно)).

Установленный порядок применяется к вышеуказанным банковским вкладам (депозитам) в случае, если по ним по состоянию на 02.08.2020 не начисляется пониженная процентная ставка или доход по вкладу не начисляется в размере ставки вклада до востребования.

2. Акцептом публичной оферты (предложения), указанной в пункте 1, является получение вкладчиком в полном объеме процентов по вкладу за период с 01.07.2020 до даты изменения размера процентов по вкладу – 02.08.2020.

**Подробности по телефону 147, на корпоративном сайте www.belarusbank.by и в отделениях «Беларусбанка»**

Сохранность и возврат вкладов гарантируются в порядке, установленном законодательством Республики Беларусь.
Лицензия на осуществление банковской деятельности № 1 от 11.01.2019, выданная Национальным банком Республики Беларусь. УНП 100325912.

**Процентная ставка по вкладам (депозитам) может быть изменена банком в одностороннем порядке в соответствии с договорами банковских вкладов (депозитов)**

---

## Антикризисный управляющий частного туристического унитарного предприятия «Агроэкоотдых» – ООО «Капитал Диалог» (организатор торгов)

**извещает о проведении 30.07.2020 г. в 10.00**
**по адресу: г. Минск, ул. Тростенецкая, 5, пом. 221**
**открытых торгов по продаже дебиторской задолженности частного туристического унитарного предприятия «Агроэкоотдых»**

КФХ «Лесная усадьба» (размер задолженности – 349140,00 BYN) – первоначальная цена 349140,00 BYN; ИП Осинцева Г. А. (размер задолженности – 100,00 BYN) – первоначальная цена 100,00 BYN; ОАО «Жлобинский карьер формовочных материалов» (размер задолженности – 420,61 BYN) – первоначальная цена 420,61 BYN. Шаг аукциона – 5 % от цены лота. Задаток для участия в аукционе – 5 % от цены лота. Прием заявлений на участие в торгах осуществляется по почтовому адресу: 220123, г. Минск, а/я 68, с даты настоящей публикации по 29.07.2020 г. Оплата задатка производится с даты настоящей публикации по 29.07.2020 г. вкл. на р/с частного предприятия «Агроэкоотдых» р/с BY81BELB30120065180040226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», код BELBBY2X, УНП 690547991. Победителем признается участник торгов, предложивший наиболее высокую цену. Заключение договора купли-продажи осуществляется в течение 10 дней со дня проведения торгов. Победитель торгов в течение 5 банковских дней со дня заключения договора купли-продажи оплачивает цену за минусом внесенного задатка. Участникам, не признанным победителями, задаток возвращается в безналичной форме в течение 5 банковских дней с момента утверждения протокола об итогах торгов. Уведомление участников об итогах торгов в день торгов, публично. Возмещение затрат на организацию и проведение торгов осуществляется участником, выигравшим торги. Участие в торгах и результаты торгов оформляются итоговым протоколом в день их проведения. В случае признания торгов несостоявшимися в связи с подачей заявления на участие в них только одним участником, предмет торгов может быть реализован этому участнику по начальной цене, увеличенной на 5 процентов. Организатор может отказаться от проведения торгов не позднее чем за один день до их проведения

---

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
**(Организатор аукциона)**
**информирует о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества ООО «БЕССЕР-БЕЛ» (Продавец)**

## ЛОТ № 1: ЗАГЛУБЛЕННЫЙ ОХРАНЯЕМЫЙ ГАРАЖ-СТОЯНКА НА 27 МАШИНО-МЕСТ,

**инв. № 500/D-708044953, 907,7 кв. м,**
**г. Минск, ул. Михася Лынькова, 19/3-1.**

Начальная цена без НДС – 258 390,00 руб.

**Аукцион состоится 22.07.2020 в 11.00**

по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.
Извещение о проведении аукциона размещено на сайте Организатора аукциона **ino.by.**

**☎ Организатор аукциона:**
**220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,**
**8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52**
**• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

УНП 190055182

---

РЕЗУЛЬТАТЫ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

## «Авто от Мастеркард. Май»

**Организатор рекламной игры:** ЗАО «Сэлмон-Графикс»,

юридический адрес: 220073, г. Минск, ул. Ольшевского, д. 22, пом. 11, ком. 43, УНП 100843219, зарегистрировано решением Минского горисполкома от 2 декабря 2008 г.

**Рекламная игра называется «Авто от Мастеркард. Май».**

Срок проведения рекламной игры: в период с 01 мая 2020 года по 06 июля 2020 года (включая периоды розыгрышей и вручения призов).

Территория проведения рекламной игры: автозаправочные станции предприятий по нефтепродуктообеспечению, входящих в состав Государственного производственного объединения «Белоруснефть», находящихся в Республике Беларусь.

Свидетельство № 3771 о государственной регистрации рекламной игры, зарегистрированной 20 апреля 2020 г., выдано Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь.

В рекламной игре приняло участие 133 093 физических лица.

Призовой фонд разыгран полностью.

Победитель рекламной игры «Авто от Мастеркард. Май»

**Главный приз № 1 – автомобиль Renault Arkana, № кузова X7LRJC2D063874195 и денежные средства для уплаты налога в размере 6 180,23 (шесть тысяч сто восемьдесят) белорусских рублей 23 копейки**

| № п/п | № Шанса | Номер карты | Ф.И.О. победителя | Населенный пункт |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 133 076 | 70833700950016979840010 | Танкович Инна Владимировна | Орша |

**Телефон горячей линии по вопросам проведения рекламной игры: (МТС - 033, А1 – 029, Life – 025) 6 431 431, круглосуточно**

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 5** |
| **Продавец** | **Червенское районное потребительское общество, Минская обл., Червенский р-н, г. Червень, ул. Ленинская, 32** |
| **Оператор ЭТП** | **ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б** |
| **Адрес ЭТП** | **www.ipmtorgi.by** |

**Предмет электронных торгов**

| Наименование | Назначение | Общая площадь | Инвентарный номер |
|---|---|---|---|
| **Лот № 1** (одним лотом) **Адрес: Минская обл., Червенский р-н, г. Червень, ул. Барыкина, д. 56** | | | |
| **Здание конторы** | Здание административно-хозяйственное | 125,6 кв. м | 615/С-40714 |
| **Холодильник** | Здание нежилое | 356,3 кв. м | 615/С-16068 |
| Составные части и принадлежности: навес, рампа-навес, рампа, уборная | | | |
| **Бондарный цех** | Здание нежилое | 416,4 | 615/С-16060 |
| **Квасильно-засолочный цех** | Здание нежилое | 317,6 | 615/С-16061 |
| Составные части и принадлежности: пристройка, уборная | | | |
| **Гараж** | Здание нежилое | 189,2 | 615/С-16063 |
| **Овощехранилище** | Здание нежилое | 1161,5 | 615/С-16065 |
| **Здание котельной** (в т. ч. котел) | Здание специализированное коммунального хозяйства | 29,8 | 615/С-40715 |
| **Торгово-распределительные склады** | Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ | 2515,6 | 615/С-40716 |

***В состав лота входят следующее оборудование:***
1.1. Оборудование торгово-распределительных складов: сплитсистема ККХА АПК-2ЕС-3.2/25МРН-45; холодильные камеры КХ-14.1 с агрегатом АГК-13/25-22 РН, КХ-22.0 с агрегатом АГК-13/25-22 РН, КХ-23.87 с агрегатом АГК-13/25-22 РН, КХ-23.87 с моноблоком, КХ-16.7 с моноблоком; конвейер ленточный наклонный; две камеры профильные холодильные 0.08 КХ-038.
1.2. Оборудование бондарного цеха: две холодильные камеры КХ-77.1 с агрегатом АК-ZF-13.25; сплитсистемы ККХА АПК-4С20.8/29МОН-45 и ЛКХА АПК-4С20.8/29МРП-45

***Сведения о земельном участке***: пл. **1,7050 га** предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания базы оптово-розничного торгового объединения. Ограничения (обременения): охранные зоны объектов газораспределительной системы (пл. 0,0432 га)

**Начальная цена лота № 1 с НДС 20 % – 1 510 086,13 бел. руб.**

| Наименование | Назначение | Общая площадь | Инвентарный номер |
|---|---|---|---|
| **Лот № 2 Адрес: Минская обл., Червенский р-н, г. Червень, ул. Горбачева** | | | |
| **Здание магазина № 15** | Здание специализированное розничной торговли | 145,3 | 615/С-16190 |
| Составные части и принадлежности: склад, котельная, сарай, туалет, пункт приема стеклотары | | | |

***Сведения о земельном участке***: пл. **0,0698 га** предоставлен продавцу на праве постоянного пользования для обслуживания и эксплуатации объектов торговли

**Начальная цена лота № 2 с НДС 20 % – 55 000,00 бел. руб.**

| Наименование | Назначение | Общая площадь | Инвентарный номер |
|---|---|---|---|
| **Лот № 3 Адрес: Минская обл., Червенский р-н, г. Червень, ул. Н. Зеневича, д. 55** | | | |
| **Кондитерский цех** | Здание специализированное для общественного питания | 702,2 | 615/С-40996 |
| Составные части и принадлежности: пристройка – литера Б1/бл, сарай – литера 1, сарай – литера 2, пристройка – литера 3, сторожка – литера 4, уборная – литера 5 | | | |

***Сведения о земельном участке***: пл. **0,4314 га** предоставлен продавцу на праве постоянного пользования участок для обслуживания строений и сооружений кондитерского цеха. Ограничения (обременения): охранные зоны сетей и сооружений водоснабжения (пл. 0,0065 га), линий электропередачи напряжением до 1000 вольт (пл. 0,0416 га), сетей и сооружений канализации (пл. 0.0615 га) и теплоснабжения (пл. 0,0167 га)

**Начальная цена лота № 3 с НДС 20 % – 696 543,00 бел. руб.**

**Задаток 10 %** от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001; в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок заключения договора купли-продажи: 15** рабочих дней после снятия продавцом зарегистрированных обременений по предмету аукциона в установленном законодательством Республики Беларусь порядке

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Часть денежных средств (лот № 1 – 1 000 000,00 бел. руб., лот № 2 – 43 200,00 бел. руб., лот № 3 – 348 271,50 бел. руб.) оплачиваются в течение 20 (двадцати) календарных дней с момента подписания протокола о результатах открытого аукциона на расчетный счет ГУЮ Миноблисполкома (для снятия запрета, установленного ОПИ), оставшаяся сумма с учетом ранее внесенного задатка оплачивается в течение 30 (тридцати) календарных дней с момента заключения договора купли-продажи (если иное не предусмотрено договором купли-продажи)

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов, установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by**

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

| | |
|---|---|
| **Дата и время начала и окончания электронных торгов** | **Начало торгов: 31.07.2020 в 12.00. Окончание торгов: 31.07.2020 в 13.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов |
| **Дата и время окончания приема заявок** | **Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 30.07.2020 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу www.ipmtorgi.by** |

**Контактные телефоны: +375 17-373-21-33; +375 (44) 704-92-06.**
**E-mail: auction@cpo.by**

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

**Организатор электронных торгов:**
ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703

**Продавец:**
ОАО «Завод «Легмаш», Витебская обл., г. Орша, пер. Восточный, 17

**Оператор ЭТП:**
ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 4б

**Адрес ЭТП:** www.ipmtorgi.by

**Предмет электронных торгов:**
**Недвижимое имущество, расположенное по адресу:**
Витебская обл., Оршанский р-н, Высоковский с/с, д. Сармацк, ул. Центральная, 11

| Лот, № | Наименование (назначение) | Общая площадь | Инв. номер |
|---|---|---|---|
